

ЧЫТАЙМА НОВЫ ЗАПАВЕТ ПА-БЕЛАРУСКУ 4



У МУЗЕІ — НІБЫТА Ў КОСМАСЕ 12



16 КРАСАВІКА 2024 г.
АЎТОРАК
№ 75 (30209)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


## Рэспубліканскі суботнік — 20 красавіка

Рэспубліканскі суботнік пройдзе ў Беларусі 20 красавіка. Адпаведную пастанову падпісаў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Грашовыя сродкі, заробленыя ў дзень правядзення суботніка, у тым ліку на працоўных месцах, пойдуць: 35 працэнтаў — Гомельскаму аблвыканкаму на рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу «Дзецям — ахвярам вайны» ў г. п. Красны Бераг Жлобінскага раёна, 35 працэнтаў — Брэсцкаму аблвыканкаму на стварэнне рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці, 30 працэнтаў — на рэканструкцыю і аднаўленне мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы, размешчаных у абласцях і Мінску.

*Міністэрства працы і сацыяльнай абароны звярнула ўвагу ўдзельнікаў рэспубліканскага суботніка 20 красавіка на меры бяспекі падчас правядзення мерапрыемстваў. Падрабязней аб гэтым — на стар. 2.*

# З ІНАВАЦЫЙНАЙ ДАКЛАДНАСЦЮ



Фота БелТА.

Цэх інавацыйнага інструменту адкрылі на Аршанскім інструментальным заводзе, які сёлета адзначае паўвекавы юбілей. На прадпрыемстве, што ўваходзіць у «МТЗ-Холдынг», ствараецца вытворчасць высокатэхналагічнага інавацыйнага інструменту, які серыйна не выпрацоўваецца ў Беларусі і імпартуецца ў нашу краіну. Аператар станкоў з лічбава-праграмным кіраваннем Яна Войтава *(на фота)* — адна з тых спецыялістаў, што будуць працаваць у новым цэху.

## ЦЫТАТА ДНЯ



Фота БелТА.

**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр (на сустрэчы з расійскім калегам Міхаілам Мішусціным):**

*«Мы даволі паспяхова працуем на ўнутраным і знешнім контуры, нягледзячы на ўсе выклікі, з якімі сутыкаюцца і Расія, і Беларусь. Сапраўды, нашы краіны прадэманстравалі сур'ёзную ўстойлівасць у гэтых няпростых умовах, эканомікі нашых краін прайшлі сур'ёзную праверку на трываласць. Такім чынам, паводле вынікаў мінулага года, ВУП і ў Расіі, і ў Беларусі падрос, прычым гэтая лічба дастаткова ўпэўненая — да чатырох працэнтаў. Запас трываласці, які сфарміраваны ў нашых эканоміках, даволі істотны, таму зладжаная і калектыўная работа нашых урадаў над агульнымі выклікамі — гэта тое, напэўна, што цяпер з'яўляецца асноўным для нас».*

Блізкая ўлада

## «Мы павінны быць адзінымі, як маналіт»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас рабочай паездкі наведала Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат, азнаёмілася з дзейнасцю, эканамічнай сітуацыяй на прадпрыемстве і правяла сустрэчу з працоўным калектывам.**



Фота БелТА.

На адкрыты дыялог са спікерам верхняй палаты парламента сабралася амаль 300 работнікаў адкрытага акцыянернага таварыства. Традыцыйная вялікая размова з членамі калектыву аб самым важным — гэта крыніца каштоўнай інфармацыі, прапаноў і ідэй, якія знойдуць сваё ўвасабленне ў заканадаўчых актах і справах на практыцы. Гэта магчымасць у будучыні прымаць правільныя рашэнні на карысць беларускага народа.

Наталля Іванаўна праінфармавала прысутных аб выніках адзінага дня галасавання, які сёлета быў праведзены ўпершыню. Яна падкрэсліла, што роля дэпутатаў мясцовых Саветаў вырасце неймаверна, таму і ўвага да электаральнай кампаніі была настолькі вялікай. Сфарміраваны 1284 Саветы дэпутатаў усіх узроўняў, выбраны 12 511 дэпутатаў, якія сёння працуюць. «Калі фарміраваўся новы склад дэпутацкага корпуса, мы, канешне, разумелі наказ Прэзідэнта, што дэпутаты павінны больш актыўна працаваць з людзьмі, гэта павінны быць асобы, якіх ведаюць, якія карыстаюцца ў грамадзян аўтарытэтам. І я вельмі спадзяюся, што менавіта такія людзі прыйшлі ў Саветы дэпутатаў, таму што роля парламента і роля мясцовых Саветаў значна вырасце», — падкрэсліла яна.

Сёння як ніколі свет непрадказальны, таму што адбываюцца геапалітычныя зрухі: на змену аднапалярнаму прыходзіць шматпалярны свет. Сітуацыя складваецца такім чынам, што яна няпростая. Мы разумеем, што павінны жыць, працаваць, развівацца па сваіх законах — рабіць усё, каб умацоўваць эканоміку нашай краіны і, у першую чаргу, захоўваць суверэнітэт і незалежнасць Беларусі. Гэта самае галоўнае. «Я заўсёды ўспамінаю словы Прэзідэнта: заваяваць суверэнітэт і незалежнасць не так складана, як утрымаць. Гэта праўда, цяпер жыццё паказвае, што гэта менавіта так», — адзначыла Наталля Качанава.

Напрыканцы размовы работнікі камбіната змаглі задаць пытанні, на якія атрымалі шчырыя адказы. На заканчэнне Старшыня Савета Рэспублікі зазначыла, што мы, беларусы, павінны заставацца і быць адзінымі, як маналіт. «Трэба, каб кожны чалавек на сваім месцы рабіў тое, што абавязаны. Паверце, гэта дасць свае вынікі», — заключыла спікер.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

*Падрабязней аб сустрэчы — у заўтрашнім выпуску «Мясцовага самакіравання».*

Нашы людзі

## МАЙСТРЫ ПЛУГОЎ

### У Віцебскай вобласці аднавілі конкурс на найлепшага аратага



**Сёлета на Шуміліншчыне ўдзел у сельскагаспадарчым спаборніцтве ўзялі дзевяць вопытных механізатараў. Падтрымала аграрыяў раёна Віцебская абласная прафсаюзная арганізацыя работнікаў аграпрамысловага комплексу.**

Падчас вясенніх палявых работ і асабліва ў Год якасці такі конкурс прафесійнага майстэрства прыйшоўся дарэчы. Нягледзячы на тое што абы хто за стырно трактароў не садзіцца, вызначэнне самага лепшага з найлепшых дае дадатковы стымул працаўнікам для яшчэ большых вытворчых дасягненняў.

На першым этапе ўдзельнікі адказалі на дваццаць тэарэтычных пытанняў: па асновах земляробства, раслінаводства, тэхналогіі і арганізацыі механізаваных работ; па ахове працы; па правілах дарожнага руху (па білетах Дзяржтэхнагляду). Затым механізатары спаборнічалі ў полі. Журы ацэньвала раўнамернасць узворвання па глыбіні, прамалінейнасць праходу, грабністасць паверхні, захаванне кантрольных ліній і разваротаў.

СТАР. 3

Навуковы падыход

## АНТАРКТЫКА, ДАЛЁКАЯ І БЛІЗКАЯ

### Які інтарэс у Беларусі каля Паўднёвага полюса



**Беларусь і Антарктыка... Паміж імі — тысячы кіламетраў. Яны размешчаны на розных паўшар'ях Зямлі. Калі ў нас зіма, там лета. Праўда, не падобнае на наша: слупок тэрмометра рэдка перавышае 0 °C, і гэта толькі на ўзбярэжжы. А паблізу полюса холаду тэмпература ў цёплы сезон падымаецца да -30 °C. Узімку, калі надыходзіць час снежных бур, маразы бываюць да -85 °C. Што ў нас агульнага і чаму айчынныя навукоўцы імкнуцца трапіць на шосты кантынент, расказаў вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі кандыдат біялагічных навук Віталь ЛУКІН.**

СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Венесуэле аднавіліся перагаворы калумбійскага ўрада з паўстанцамі



Чарговы раўнд перагавораў аб міры паміж прадстаўнікамі ўрада Калумбіі і леварадыкальнай паўстанцкай групоўкай «Армія нацыянальнага вызвалення» (АНВ) праходзіць у Венесуэле. Аб гэтым заявіла калумбійская дэлегацыя на сваёй старонцы ў сацсетцы, паведаміла ТАСС. Чарговы раўнд перагавораў прадоўжыцца да 22 красавіка. Перагаворны працэс з АНВ, якая была заснавана ў 1964-м, працягваецца амаль дзесяць гадоў. У Гаване сёлета ў лютым бакі дамовіліся прадоўжыць рэжым спынення агню да жніўня. «Армія нацыянальнага вызвалення» з'яўляецца найбуйнейшай паўстанцкай узброенай групоўкай, якая налічвае некалькі тысяч байцоў. У 2016-м урад Калумбіі заключыў пагадненне аб міры з групоўкай «Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі». Гэты дагавор практычна паклаў канец унутранаму ўзброенаму канфлікту, які доўжыўся больш чым 50 гадоў і забраў жыцці звыш 250 тысяч чалавек.

### У Судане за год канфлікту загінула больш як 13 тысяч чалавек

ISSN 1990 - 763X

Звыш 13 тысяч чалавек загінула, больш чым 30 тысяч пацярпела за год узброенага канфлікту ў Судане, заявіў РІА «Новости» міністр аховы здароўя краіны Хейсам Мухамед Ібрагім. Ён ахарактарызаваў тое, што адбываецца, як найбуйнейшую катастрофу ў гісторыі Судана. У сталічнай правінцыі Хартум больш як 70 працэнтаў бальніц і медыцынскіх устаноў выйшлі са строю з-за абстрэлаў з боку Сіл хуткага рэагавання (СБР, ваенізаваныя фарміраванні). З 15 красавіка мінулага года ў Судане ідуць разлютаваныя баі паміж СБР і рэгулярным войскам. Бакі абменьваюцца супярэчлівымі заявамі наконт поспехаў у баявых дзеяннях і кантролі над аб'ектамі, разгарнуўшы маштабную інфармацыйную вайну ў СМІ і сацсетках. Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа заявіў, што баі, якія працягваюцца некалькі месяцаў, могуць прывесці да ўспышак хвароб і фатальнага калапсу сістэмы аховы здароўя. Паводле даных ААН, больш чым 8,2 мільёна чалавек у Судане пакінулі свае дамы з-за баявых дзеянняў, з іх каля 1,7 мільёна збеглі ў суседнія краіны.



### У ЗША чакаецца нашэсце трыльёнаў цыкад



Нашэсце мільярдаў ці нават трыльёнаў цыкад чакаецца ў ЗША ўпершыню з пачатку XIX стагоддзя. Аб гэтым паведаміў тэлеканал Fox News. У матэрыяле падкрэсліваецца, што сёлета ў ЗША чакаецца нашэсце цыкад «Пакаленні XIX» і «Пакаленні XIII». Па традыцыі, закладзенай яшчэ ў XIX стагоддзі, нумарацыя даецца ім рымскімі лічбамі. Паводле інфармацыі тэлеканала, наступны такі феномен можа адбыцца ўжо ў 2244 годзе. У адрозненне ад саранчы цыкады практычна не наносяць шкоды сельскай гаспадарцы і не ўяўляюць нябяспекі для чалавека. Наадварот, яны з'яўляюцца крыніцай ежы для птушак і грызуноў, а таксама паляпшаюць фільтраванне вады ў глебу. Аднак, паводле інфармацыі навукоўцаў, цыкады могуць быць небяспечныя для маладых дрэў.

## КОРАТКА

- **У Беларусі ў 106 раёнах дзейнічаюць абмежаванні на наведванне лясоў.**
- Раннія яравыя культуры ў нашай краіне пасеялі на 82 працэнты плошчаў.
- **Сярэдняя стаўка па новых тэрміновых рублёвых дэпазітах фізічных асоб у сакавіку склала 9,66 % гадавых.**
- З 1 студзеня 2024 года бязвізавым парадкам уезду скарысталіся 66 165 замежнікаў з Еўрасаюза: 33 160 грамадзян Літвы, 15 668 грамадзян і 4077 неграмадзян Латвіі, а таксама 13 260 замежнікаў з польскімі пашпартамі.
- **Батанічны сад 19—21 красавіка запрашае ў закрыты калекцыйны фонд квітнеючых пеларгоній.**

Напярэдадні

## СЕЗОННЫЯ ПЛЯЖЫ ПАВІННЫ АТРЫМАЦЬ ПАШПАРТЫ ГАТОЎНАСЦІ

**Сёлета да пачатку купальнага сезона адкрыецца 459 пляжаў. Пра гэта расказала вядучы спецыяліст РДГА АСВОД Кацярына МІХАЛЁВА. Цяпер ідзе падрыхтоўка да атрымання пашпартоў гатоўнасці на гэтыя аб'екты. «На жаль, 133 пляжы з гэтага ліку пакуль не маюць пастоў АСВОД, але работа ў гэтым кірунку таксама вядзецца. У Мінскай вобласці ўжо адкрылася 16 новых пастоў, усяго іх тут будзе працаваць 42», — паведаміла Кацярына Міхалёва.**

Адным з найважнейшых мерапрыемстваў перад атрыманнем пашпарта гатоўнасці на пляж з'яўляецца абследаванне вадаёма. Па словах спецыяліста, пры яго правядзенні ўлічваецца не толькі глыбіня, але і характарыстыкі спуску (не павінна быць ям або рэзкага перападу ўзроўняў адразу каля берагавой лініі). Правяраецца якасць грунту, засмечанасць дна староннімі прадметамі, у тым ліку рачнымі раслінамі, і многае іншае. Больш за ўсё вадаёмаў, на якіх купанне забаронена, знаходзіцца ў Гомельскай і Брэсцкай абласцях.



СТАР. 3

Будзьце ў курсе

# ЖАНЧЫНАМ — НЕ БОЛЬШ ЗА СЕМ КІЛАГРАМ

## Якія меры бяспекі працы трэба выконваць падчас суботніка

**Традыцыйна падчас суботніка жыхары краіны займуцца добраўпарадкаваннем працоўных месцаў, аб'ектаў і тэрыторый населеных пунктаў, гісторыка-культурных каштоўнасцяў, мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы часоў Вялікай Айчыннай вайны.**



Наймальнік павінен улічваць, што, калі падчас суботніка работнікі будуць працаваць на сваіх працоўных месцах, забеспячэнне здаровых і бяспечных умоў працы павінна ажыццяўляцца ў звычайным рэжыме. У іншым выпадку з імі павінен праводзіцца мэтавы інструктаж па ахове працы згодна з відам работ, якія будуць выконвацца.

«Пры выкананні работ па добраўпарадкаванні на тэрыторыі сваёй арганізацыі інструктаж па ахове працы праводзіцца непасрэдным кіраўніком работ наймальніка. Пры выкананні работ на тэрыторыі іншай арганізацыі — непасрэдным кіраўніком работ або спецыялістам арганізацыі, на тэрыторыі якой яны будуць праводзіцца», — адзначылі ў Мінпрацы.

Пры правядзенні мэтавага інструктажу павінна быць праведзена апытанне работнікаў аб стане здароўя. Нельга дапускаць да работы асоб у выпадку пагаршэння іх самаадчування, звязанага з прастуднымі захворваннямі, ці ў хворым стане, у стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення, а таксама работнікаў, якія не маюць адпаведнай падрыхтоўкі, не забяспечаны сродкамі індывідуальнай абароны, да выканання работ з павышанай небяспекай.

Наймальнік павінен забяспечыць выкананне норм пад'ёму і перамяшчэння цяжараў уручную жанчынамі, якія прымаюць удзел у суботніку, — не больш за 7 кг. А таксама прыняць меры, якія выключаюць магчымасць наезду тэхнікі і траўміравання рухомымі часткамі машын і механізмаў.

Мінпрацы таксама звярнула ўвагу, што работнікі, якія ўдзельнічаюць у суботніку, павінны быць забяспечаны неабходным інструментам, інвентаром, сродкамі індывідуальнай абароны (пальчаткамі або рукавіцамі, пры рабоце на праезнай частцы — камізэлькамі сігнальнымі, пры рабоце на будаўнічым аб'екце — ахоўнымі каскамі).

На слыху

# «САВА» НА ІЛЮМІНАТАРЫ

## Беларуская касманаўтка Марына Васілеўская правяла на МКС навуковы эксперымент, распрацаваны вучонымі БДУ

**У нашы дні Беларусь захоплена космасам, а Марына Васілеўская стала Героем краіны і ў літаральным, і ў агульначалавечым сэнсе. Пра яе гавораць, пра яе пішуць, банеры з яе выявай красуюцца ў Мінску і не толькі. Аднак за фасадам усеагульнага свята хаваецца хоць і больш празаічная, але не менш знамянальная падзея: сваю касмічную місію першая жанчына-касманаўт у гісторыі суверэннай Беларусі выканала.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Як вядома, у праграме дванаццацідзённага палёту Васілеўскай было сем працоўных задач: два грамадска-адукацыйныя і пяць навукова-даследчых эксперыментаў. Касмічны эксперымент па даследаванні зямной паверхні, вывучэнні працэсаў і наступстваў прыродных і тэхнагенных з'яў і катастроф распрацоўвалі вучоныя БДУ і Інстытута фізікі НАН Беларусі. Дырэктар Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем імя А. М. Сеўчанка БДУ Пётр КУЧЫНСКІ расказвае, як усё было.

— Гэты план мы, сумесна з Інстытутам фізікі НАН Беларусі распрацоўвалі каля года. У лік асноўных этапаў эксперымента ўваходзілі маніторынг сельскагаспадарчых і лясных угоддзяў беларускага Палесся, ацэнкі іх стану і ступені забруджанасці. І, дарэчы, для гэтага этапу выкарыстоўвалася навуковая апаратура, распрацаваная супрацоўнікамі нашага інстытута.

Комплекс для правядзення эксперымента складаецца з відэаспектральнай сістэмы (ВСС) і платформы яе навядзення «Сава». ВСС уяўляе сабой здымачнае абсталяванне для дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі з космасу шляхам атрымання каляровых лічбавых фотавыяў аб'ектаў зямной паверхні і іншай спектральнай інфармацыі.

Работа гэтага апарата дазваляе адсочваць экалагічную сітуацыю на пэўных тэрыторыях і стан атмасферы над імі, выяўляць тэхнагенныя выкіды прамысловых прадпрыемстваў, сачыць за зменамі расліннага покрыва ў наваколлях гарадоў і зоне адчужэння Чарнобыльскай АЭС і іншае. Акрамя таго, у задачы ВСС уваходзіць выяўленне неспрыяльнага антрапагеннага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе і фіксаванне ачагоў узгарання ў лясных масівах.

Для назірання за зямной паверхняй і правядзення здымкі апаратура размяшчаецца на ілюмінатарах МКС. Для аўтаматызацыі быў распрацаваны комплекс «Сава», які здольны кіраваць здымачнымі прыладамі ВСС дыстанцыйна, без удзелу аператара. Выглядае гэта так: касманаўт атрымлівае з Зямлі файл са спісам задач і загружае яго ў праграму кіравання сістэмы «Сава», якая сама разлічвае траекторыю МКС, час здымкі і вуглы навядзення на аб'екты, паварочвае здымачную апаратуру, дае каманду на здымку і ўтрымлівае аб'ект у полі зроку.

Вось такім чынам, здзяйсняючы эксперымент, Марына Васілеўская атрымала даныя па стане экалагічнай сітуацыі ў беларускіх рэгіёнах. Гэта дасць магчымасць у найбліжэйшым будучым пабудаваць тэматычныя карты знятых тэрыторый, абнавіць базы даных, спрагназаваць наступствы прыроднага, антрапагеннага і тэхнагеннага ўплыву, выпрацаваць меры па іх устараненні і прадухіленні. Вынікі касмічнага эксперымента будуць выкарыстаны профільнымі міністэрствамі Беларусі.

Яшчэ ў рамках касмічнага эксперымента наша зямлячка пратэсціравала навуковае абсталяванне для далейшай карэкціроўкі параметраў здымачнай апаратуры і методык яе навядзення з дапамогай комплексу «Сава».

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

# АНТАРКТЫКА, ТАКАЯ ДАЛЁКАЯ І БЛІЗКАЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Віталь Васільевіч, вы былі ўдзельнікам 15-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі (БАЭ), каля чатырох месяцаў даследавалі лядовыя абшары. Няўжо ўсе таямніцы роднай беларускай зямлі ўжо раскрыты і інтарэсы навукоўцаў цяпер далёка за морамі і акіянамі?***

— У нашай прыроды таямніц шмат, хопіць не на адно пакаленне даследчыкаў, тым больш пастаянна ўдасканальваюцца метады, з'яўляюцца новыя інструменты, якія дазваляюць значна глыбей вывучаць тыя ці іншыя аб'екты. Аднак Антарктыда з прычыны сваёй аддаленасці ад цывілізацыі шмат у чым захавала першароднае аблічча, яе экасістэмы можна расцэньваць як своеасаблівы эталон для пэўных даследаванняў, напрыклад дынамікі і адаптацыі супольнасцяў да кліматычных змен. Для вучоных заўсёды важна знайсці і вызначыцца з пунктам адліку. Ведаючы, што ў Антарктыдзе ўжо больш за паўтара дзясятка гадоў ёсць свой беларускі «пункт апоры», так бы мовіць, прырода гэтага рэгіёна для нас стала нечужой.

У 2006 годзе два беларускія спецыялісты Леанід Турышаў і намеснік начальніка Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Аляксей Гайдашоў сталі першымі прадстаўнікамі суверэннай Беларусі на ледніковым мацерыку ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы па даследаванні палярных рэгіёнаў Зямлі. Перад імі стаяла задача правесці рэкагнасціровачныя даследаванні па выбары пастаяннага месца базіравання і ацаніць перспектывы стварэння нацыянальнай даследчай інфраструктуры ў Антарктыдзе. Амаль праз дзесяць гадоў, у снежні 2015 года, быў закладзены першы аб'ект Беларускай даследчай станцыі «Гара Вячэрняя» (БАС). Па стане на 31 снежня 2023 г. БАС складаецца з больш як дзясятка аб'ектаў рознага прызначэння. Яе канструктыўныя асаблівасці і матэрыялы дазваляюць вытрымліваць 60-градусныя маразы і парывы ветру да 80 м/с. Таўшчыня сцен з негаручага пенаполіўрэтану дасягае 100 мм.

***— Наколькі багаты жывёльны і раслінны свет Антарктыкі?***

— Калі браць наземную біёту, то яна, вядома, больш сціплая, чым на іншых кантынентах. Але вонкавы выгляд ледзяной пустыні падманлівы. Млекакормячыя прадстаўлены марскімі відамі — цюленямі і кітамі. У літаратуры пазначана 16 відаў. Мне за час экспедыцыі пашчасціла ўбачыць цюленя-крабаеда і цюленя Уэдэла, а падчас даследаванняў на навукова-экспедыцыйным судне (НЭС) «Акадэмік Фёдараў» — кітоў: паўднёвага малога паласаціка і кашалота. Птушак вядома 47 відаў. Рэптылій і амфібій не выяўлена. У прэсных вадаёмах сустракаюцца водарасці, бактэрыі і зоапланктон. А калі ўзяць Паўднёвы акіян, то цяжка нават прыкладна ўявіць, колькі рыб яго насяляе (у актуальнай літаратуры пазначаецца не менш як 200 відаў), пра марскіх беспазваночных я наогул прамаўчу... Нездарма кажуць, што пра космас мы ведаем больш, чым пра акіяны. Так што патэнцыял даследаванняў вялізны.

Флора складаецца ў асноўным з лішайнікаў і мхоў. Ёсць толькі два віды вышэйшых раслін — калабантус кіта (Colobanthus quitensis) і вострына антарктычная (Deschampsia antarctica), але яны растуць на антарктычным паўвостраве. Царства грыбоў прадстаўлена мікраміцэтамі, іх разнастайнасць якраз вывучаецца ў нашым інстытуце.

Калабантус кіта — квітнеючая расліна сямейства гваздзіковых, якая вонкава нагадвае мхі. Дасягае ў вышыню ад 1,5 да 8 см. Нізкае ўтрыманне вады ў тканках (адметнасць, уласцівая ўсёй расліннасці Антарктыды) перашкаджае абледзяненню клетак, таму калабантус кіта паспяхова супрацьстаіць маразам.





Вострына антарктычная — расліна сямейства злакаў. Добра прыстасаваная да суровых умоў: мае кароткі вегетацыйны перыяд, вытрымлівае замаразкі нават падчас цвіцення. У 1960-х гадах вострына ў асноўным расла на ўчастках Антарктыды, якія заставаліся свабоднымі ад лёду на працягу 6600 гадоў. Аднак пасля 2009-га гэтыя расліны ўсё часцей засяляюць тэрыторыі, што вызваліліся ад лёду за апошнія стагоддзі.

***— У чым заключаецца работа навукоўцаў-біёлагаў у экспедыцыі?***

— У асноўным гэта збор узораў раслін і арганічных субстратаў на прадмет усё тых жа мікраміцэтаў або іншых мікраарганізмаў, даследаванне марскіх арганізмаў, улік млекакормячых і птушак. І няважна, хто ты па спецыялізацыі — заолаг або батанік, — ты павінен па максімуме выканаць праграму даследаванняў, заданне якой сфарміравана зыходзячы з навуковых і перспектыўных практычных інтарэсаў.

***— Правесці за палярным кругам 130 дзён... Для вучонага — гэта многа ці мала? Ці ўсё ўдалося зрабіць?***

— Мне пашанцавала не так, як іншым членам экспедыцыі: я правёў на кантыненце ўсяго два месяцы, а яшчэ два з паловай — на НЭС «Акадэмік Фёдараў». Затое геаграфія маіх даследаванняў уключала расійскія станцыі «Прагрэс» і «Мірны». Падчас марской часткі ўдалося правесці шмат назіранняў за птушкамі і марскімі млекакормячымі, а на станцыях — сабраць перспектыўны матэрыял, які цяпер знаходзіцца ў працэсе апрацоўкі. Дзякуючы супрацоўніцтву з удзельнікамі 68-й Расійскай антарктычнай экспедыцыі (РАЭ) удалося пабываць у сапраўды ўнікальных месцах, дзе рэдка ступала нага чалавека.

Антарктыда — тэрыторыя, якая носіць афіцыйны статус запаведніка сусветнага значэння, дзе працуюць навукоўцы з усяго свету. Там увогуле размешчана больш як сто пастаянных і сезонных навуковых станцый і баз, якія прадстаўляюць 55 дзяржаў, што ўваходзяць у Дагавор аб Антарктыцы.



***— На вашу думку, у перспектыве якія кірункі работы вучоных-біёлагаў у Антарктыдзе будуць найбольш актуальныя?***

— Паўтаруся, антарктычныя экасістэмы — гэта эталон. У нас ёсць унікальны шанц захаваць яго ў першародным выглядзе і, адсочваючы дынаміку экасістэм, ацэньваць уплыў глабальных працэсаў. Перспектыўнымі, на мой погляд, з'яўляюцца ў першую чаргу даследаванні раслінных супольнасцяў у прывязцы да іх месцазнаходжання. Гэта эталонныя экасістэмы, своеасаблівыя індыкатары змяненняў клімату і іншых працэсаў. Класіфікацыя дапаможа ацаніць патэнцыял біялагічнай разнастайнасці існуючай і патэнцыяльнай і, як вынік, паслужыць больш дакладнаму разуменню генетычнага рэсурсу. Атрыманне чыстых культур мікраміцэтаў і экстрэмафільных бактэрый адкрывае магчымасці пошуку каштоўных ферментаў і біялагічна актыўных рэчываў, якія дзейнічаюць пры нізкіх тэмпературах. Прарыўны кірунак — вывучэнне фітахімічнага і фармакалагічнага патэнцыялу прадстаўнікоў ліхенабіёты і брыяфлоры Антарктыкі, заснаваны на прымяненні сучасных омікс-тэхналогій, у тым ліку метаболомнага прафілявання ўзораў, іх імунамадулявальнага дзеяння ў адносінах да імунакампетэнтных клетак чалавека і супрацьпухліннага дзеяння ў дачыненні да розных ліній пухлінных клетак in vitro. Дарэчы, такія работы вядуцца ўжо ў навуковых арганізацыях Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у тым ліку і ў нашым інстытуце. Патэнцыял вывучэння марской біёты, пэўна, невычэрпны як сам акіян. Такім чынам, вывучэнне і захаванне біялагічнай разнастайнасці, і не толькі Антарктыды, — гэта каласальная інвестыцыя ў будучыню. Менавіта таму, здавалася б, такая далёкая і халодная Антарктыда на самай справе блізкая па мэтах і задачах нашай біялагічнай навуцы.

**Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ.**
**Фота Віталя ЛУКІНА.**


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности · Проведение торгов · Ликвидация · Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) в газете «Звязда» № 56 от 14.02.2024 № 31 (30165), стр. 6**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. | Минимальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 134/D-3258 (наименование: **столовая,** назначение: помещение общественного питания), адрес: Брестская обл., Лунинецкий р-н, 13-1, 1,1 км северо-западнее д. Ситница, общая площадь – 865,3 кв. м | 36 278,72 | 21 767,23 |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 30 (тридцать) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона), либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 26.04.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 25.04.2024 г. до 17.00** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |



# ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту: «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения по ул. Тимирязева в г. Минске» 2-я очередь строительства,**

*опубликованную в газете «Звязда» от 08.02.2024 № 27 (30161)*

**Раздел «Информация об объекте строительства» дополнить пунктом 2.3.4.2. следующего содержания:**

«**2.3.4.2.** Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства в жилых домах по г. п. № 2.1, 2.3 следующие объекты:

1) 5 квартир в жилом доме по г. п. № 2.1. Проектные номера квартир, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади:

Проектная квартира № 1, общая площадь 107,44 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5600 белорусских рублей.

Проектная квартира № 11, общая площадь 106,52 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5700 белорусских рублей.

Проектная квартира № 30, общая площадь 48,79 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6400 белорусских рублей.

Проектная квартира № 57, общая площадь 67,97 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 69, общая площадь 93,96 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6000 белорусских рублей.

2) 5 квартир в жилом доме по г. п. № 2.3. Проектные номера квартир, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади:

Проектная квартира № 16, общая площадь 138,45 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5600 белорусских рублей.

Проектная квартира № 18, общая площадь 85,26 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5600 белорусских рублей.

Проектная квартира № 24, общая площадь 137,43 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 27, общая площадь 108,19 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6000 белорусских рублей.

Проектная квартира № 32, общая площадь 137,43 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 7000 белорусских рублей.

3) 6 машиномест (парковочное место) в жилом доме по г. п. № 2.3. (проектные номера машиномест № 5, № 7, № 8, № 10, № 11, № 12) стоимость строительства машиноместа составляет 66700 белорусских рублей.

4) 1 административно-торговое помещение № 3 в жилом доме по г. п. № 2.1 (АТП № 3, общей площадью 120,79 кв. метров). Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади предлагаемого административно-офисного помещения составляет 8200 белорусских рублей.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения, и иных факторов, влияющих на стоимость. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта долевого строительства».

УНП 192827731



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **КУП «МИНОБЛАВТОСЕРВИС»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения

Аукцион состоится **02.05.2024 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

**Лот № 1:** ГОЛАЗ-52911, кузов (рама) № VS2K4X20001848408. Начальная цена с НДС 20 % – 11 280,00 руб.

**Лот № 2:** TOYOTA LAND-CRUISER, кузов (рама) № JTEBU29J005148250. Начальная цена с НДС 20 % – 61 080,91 руб.

**Лот № 3:** TOYOTA LAND-CRUISER 120, кузов (рама) № JTEBU29J005144716. Начальная цена с НДС 20 % – 54 576,98 руб.

**Место нахождения Лотов №№ 1–3:** г. Минск, ул. Петруся Бровки, 27.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу **gki.gov.by,** Минского областного исполнительного комитета **minsk-region.gov.by** и на электронной торговой площадке «GOSTORG» Организатора аукциона **gostorg.by.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

# МАЙСТРЫ ПЛУГОЎ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Пасля напружаных выпрабаванняў канкурсантаў чакала палявая кухня, да якой яны звыклыя ў сваёй рабоце. Арганізатары спаборніцтва на званне найлепшага аратага адзначылі, што такое мерапрыемства можа перайсці ў разрад традыцыйных, бо для працаўнікоў сельскай нівы важныя не толькі вытворчыя паказчыкі, але і ўсведамленне, што яны сапраўдныя майстры ў сваёй справе, якіх цэняць за старанасць.

Пераможцаў выявілі ў двух катэгорыях. Імі сталі **Віталь АНТОНАЎ** з адкрытага акцыянернага таварыства «Прыазёрны свет» і **Рыгор КАВАЛЁЎ** з унітарнага прадпрыемства «Шумілінскі райаграсэрвіс». Механізатары атрымалі дыпломы, каштоўныя падарункі і грашовыя прэміі.




працы Сяргей займаецца ўзворваннем глебы, нарыхтоўкай кармоў і саломы. Пасля ўдзелу ў раённым конкурсе «Найлепшы араты — 2024» паабяцаў, што абавязкова вернецца ў наступным годзе, паспрабуе яшчэ раз узяць высокую аграрную вяршыню.

Самым вопытным механізатарам быў прызнаны **Васіль АГЛУШЭВІЧ** з камунальнага ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Ульскі», у якім ён працуе амаль чвэрць стагоддзя. Канкрэтна працы на трактары механізатар аддаў 15 гадоў, мужчына задзейнічаны ва ўсіх этапах падрыхтоўкі глебы. А летам вопытны кіроўца перасаджваецца на камбайн — пажынае вынікі сваёй асеннее-веснавой працы. Асаблівым сваім гонарам Васіль лічыць тое, што ўслед за ім яго 17-гадовы сын плануе паступаць у Беларускую дзяржаўную сельгасакадэмію.


Фота БелТА.

Па словах **намесніка старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама Мікалая КАРАТКЕВІЧА,** трэба адраджаць традыцыі і вяртацца да найлепшага. У першую чаргу падобныя конкурсы аб'ядноўваюць і стымулююць на больш высокія дасягненні. Ён пажадаў механізатарам з лёгкасцю прайсці пасяўную.

Спецыяльныя прызы ад галіновага прафсаюза атрымалі самы малады і самы вопытны механізатары. **Сяргей ТРОШЫН** з ААТ «АграБаравінка» ўпершыню прымаў удзел у конкурсе прафмайстэрства, але за стырном трактара ён ужо 15 гадоў. Выбар прафесіі ў бок сельскай гаспадаркі зрабіў па прыкладзе бацькі, які ўсё жыццё адпрацаваў механізатарам, і маці, якая таксама прысвяціла шмат гадоў гэтай галіне. На

**Прафсаюзны лідар аграрыяў вобласці Таццяна ДЗІКАНАВА** падзякавала механізатарам за іх неацэнны ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны паўночнага рэгіёна. «У перыяд усіх важных сельскагаспадарчых кампаній на перадавой з аграрыямі знаходзіцца і галіновы прафсаюз. Сёлета па выніках веснавых палявых работ будуць падводзіцца вынікі абласных спаборніцтваў па шасці намінацыях у залежнасці ад відаў работ і прадукцыйнасці тэхнікі. Гэта, напрыклад, культывацыя глебы, унясенне ўгнаенняў. Таксама прафсаюз будзе сачыць за бяспекай механізатараў; кантраляваць, як яны забяспечаны гарачым харчаваннем, спецадзеннем, сродкамі індывідуальнай абароны», — падкрэсліла Таццяна Мікалаеўна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,
фота аўтара.**

# Кіравацць мядзведзем будуць па плане

## Якія змяненні чакаюцца ў новай рэдакцыі Чырвонай кнігі

**Захаванне рэдкіх і знікальных відаў раслін і жывёл — адна з прыярытэтных задач, вырашэнне якой ажыццяўляецца на дзяржаўным узроўні. Адным з элементаў гэтай работы з'яўляецца вядзенне нацыянальнай Чырвонай кнігі. Спецыялісты расказалі аб падрыхтоўцы да выдання новай рэдакцыі Чырвонай кнігі Беларусі.**


**Катэгорыю аховы мяркуюць панізіць і для рысі.**

Першае выданне, нагадала **кансультант упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна ЖАЛЯЗНОВА**, было выпушчана ў 1981 годзе. Гэта аднатомнік, куды ўвайшло 80 відаў жывёл і 85 — дзікарослых раслін. Другое выданне ўбачыла свет у 1993-м і складалася ўжо з двух тамоў — жывёлы (182 віды) і расліны (214 відаў). Гэта значыць, дадаткова ўключылі 107 новых відаў жывёл і 109 — раслін. Але адначасова выключылі 5 і 14 відаў, адпаведна. Трэцяе выданне выйшла ў 2006 годзе і змяшчала 189 відаў жывёл і 214 — дзікарослых раслін. Дадалося 64 новыя, выключана 57 — па жывёлах; і 91 і 31 — адпаведна, па раслінах.

Цяпер дзейнічае чацвёртае выданне Чырвонай кнігі. У яго ўваходзіць 203 віды жывёл і 303 — раслін. У параўнанні з папярэдняй рэдакцыяй колькасць відаў жывёл павялічылася на 14, а раслін — на 29. Але былі выключаны, напрыклад, рапушка еўрапейская, вялікая белая чапля, сліва калючая, звычайны падуст.

Як адзначыла спецыяліст Мінпрыроды, нягледзячы на тое, што агульная колькасць відаў у Чырвонай кнізе з гадамі павялічваецца, усё ж некаторыя з іх выключаюцца са спіса рэдкіх і знікальных. І гэта адбываецца дзякуючы мерам, якія спрыяюць паляпшэнню стану папуляцый і дазваляюць мяняць статус аб'ектаў. Асноўная ж прычына папаўнення чырванакніжнага спіса — змяненне клімату і антрапагенная нагрузка.

У мэтах захавання рэдкіх жывёл і раслін Мінпрыроды вядзецца работа па перадачы пад ахову і ўліку месцаў пражывання і росту такіх аб'ектаў. Пры гэтым устанаўліваецца спецыяльны рэжым, які землекарыстальнік або ўладальнік воднага аб'екта абавязаны выконваць. Так, пачынаючы з 2021 года ў цэлым па краіне аформлена 1237 месцаў росту і пражывання чырванакніжнікаў: у Брэсцкай вобласці 85 месцаў, Віцебскай — 160, Гомельскай — 157, Гродзенскай — 297, Мінскай — 449, Магілёўскай — 89. Акрамя таго, распрацоўваюцца і рэалізоўваюцца планы дзеянняў па захаванні такіх відаў. Ужо выконваюцца 16 планаў па дзікіх жывёлах і 30 — па дзікарослых раслінах. У гэтым годзе Нацыянальнай акадэміяй навук будзе актуалізаваны план па кіраванні папуляцыяй рысі і аналагічныя дакументы распрацаваны для мядзведзя, барсука. Пры гэтым датычна мядзведзя будзе праведзены ўлік па новай методыцы.

Сёлета працягнецца работа над новай — пятай рэдакцыяй нацыянальнай Чырвонай кнігі. Плануецца, што ў яе ўключаць 305 відаў раслін, пры гэтым 26, якія раней уваходзілі ў 4-е выданне, — будуць выключаны, паведаміла Таццяна Жалязнова. Што датычыцца жывёл, то мяркуецца ў наяўны спіс уключыць 21 новы від і выключыць з яго 12. Па шэрагу відаў жывёл прыродаахоўны статус будзе паніжаны.

Як растлумачыў **генеральны дырэктар НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Аляксандр ЧАЙКОЎСКІ**, сярод новых чырванакніжнікаў з'явіцца гіганцкая вячэрніца (Nyctalus lasiopterus). Нядаўна было выяўлена месцазнаходжанне невялікай калоніі ў Гомельскай вобласці. Гэтаму самаму буйному ў Еўропе кажану будзе нададзены прыродаахоўны статус 1-й катэгорыі.

За апошнія 30 гадоў у Беларусі вырасла колькасць зуброў у 9 разоў. Таму катэгорыю аховы для яго мяркуецца панізіць з 3-й на 4-ю. Бурага мядзведзя чакае паніжэнне з 1-й на 4-ю катэгорыю. Таксама будзе паніжана катэгорыя для рысі і барсука. Дзякуючы станоўчай дынаміцы росту колькасці, палепшыцца становішча гарнастая. Яго перавядуць з 3-й у 4-ю катэгорыю. А вось звычайны хамяк, якога ўжо шмат гадоў не рэгіструюць у краіне, зменіць катэгорыю з 3-й на 1-ю.

Што да птушак, то навукоўцы прапануюць заходні падвід глушца ўключыць у Чырвоную кнігу з наданнем яму 2-й катэгорыі. Апошнія 20 гадоў яго колькасць скарацілася практычна ў два разы. Стан папуляцый арлана-белахвоста, дамавога сыча, залацістай шчуркі, драча палепшыліся, і катэгорыю прыродаахоўнага статусу для іх мяркуецца панізіць.

Сярод рыб ручаёвую стронгу, верагодна, перавядуць з 2-й у 3-ю катэгорыю. А, як мяркуюць спецыялісты, з-за актыўнасці чужароднага ратанагалавешкі катэгорыю абарыгеннага віду — гальяна азёрнага вымушана павысяць з 3-й да 1-й.

Усе прапановы па змяненнях статусаў рэдкіх і знікальных відаў, адзначыў Аляксандр Чайкоўскі, будуць яшчэ абмяркоўвацца, і не толькі ў вузкім коле спецыялістаў, але і з прыцягненнем грамадскасці.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды» аб мэтазгоднасці правядзення ўліковых мерапрыемстваў па мядзведзі без звестак аб прыдатных для яго месцаў пасялення і нявызначанасцю пераважнай шчыльнасці звера на адзінку плошчы, Таццяна Жалязнова растлумачыла, што ўсё ж улікі — гэта крок да планамернай работы па кіраванні папуляцыяй. Сёлетні год фактычна трэці па ўліку мядзведзяў. Раней выкарыстоўваўся анкетны метад. Ён дапускаў вялікую хібнасць. У канцы мінулага года ў НПЦ па біярэсурсах была распрацавана новая методыка, якая прадугледжвае большую дакладнасць. Яе апрабуюць сёлета. Выкарыстоўваючы актуалізаваныя даныя, у якіх павінны будуць знайсці адлюстраванне як колькаснае, так і геаграфічнае размеркаванне асобін, распрацуюць план кіравання папуляцыяй. Пры гэтым спецыяліст Мінпрыроды акцэнтавала ўвагу на тым, што ў выпадку ўзнікнення праблемных сітуацый з буйным драпежнікам механізмы вырашэння канфлікту працуюць ужо сёння. Камісіі, створаныя ў мясцовых органах улады, маюць права прымаць рашэнні аж да выдалення з асяроддзя пасялення агрэсіўных асобін.

**Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ,
фота аўтара.**

Фінансавая палітыка

# ІЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ МАЛАДЫМ РАБОТНІКАМ

## Хто можа на яго прэтэндаваць?




**Як вядома, з 17 чэрвеня гэтага года ўступіць у сілу Указ Прэзідэнта «Аб прадастаўленні льготных крэдытаў асобным катэгорыям грамадзян».**

Згодна з указам, у чэрвені запрацуе крэдытная праграма ад Беларусбанка, па якой стаўка па крэдыце складзе 25 % ад стаўкі рэфінансавання. На сёння гэта 2,38 % гадавых. Варта адзначыць, што дадзеным відам крэдыту змогуць скарыстацца далёка не ўсе спецыялісты.

Яго дадуць тым, хто быў накіраваны на работу ў арганізацыі не па месцы жыхарства бацькоў. Таксама скарыстацца льготным крэдытам змогуць маладыя людзі, першае месца работы якіх знаходзіцца на прадпрыемствах у раёнах, што пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС.

У спісе тых, каму выдадуць ільготны крэдыт, з'явіліся і маладыя спецыялісты, якія па размеркаванні былі накіраваныя ў сельскую мясцовасць. Дзеянні ўказа распаўсюджваюцца і на маладых людзей, якія самастойна на працягу шасці месяцаў пасля заканчэння навучання працаўладкаваліся ў арганізацыі з рэгістрацыяй у сельскіх населеных пунктах.

Права атрымаць ільготны крэдыт будзе і ў выпускнікоў, якія на працягу шасці месяцаў пасля заканчэння навучання добраахвотна паступяць на ваенную службу па кантракце ў воінскія часці, арганізацыі Узброеных Сіл, органы пагранічнай службы, размешчаныя ў населеных пунктах не па месцы жыхарства бацькоў.

Характэрна, што дадзены спажывецкі крэдыт выдадуць толькі адзін раз на тэрмін да пяці гадоў. Максімальная сума, якую змогуць атрымаць маладыя спецыялісты, складае да 30 бюджэтаў пражытачнага мінімуму. Дарэчы, каб атрымаць максімальную суму ў 13 038 рублёў, даход крэдытаатрымальніка павінен складаць парадку 680 рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СЕЗОННЫЯ ПЛЯЖЫ ПАВІННЫ АТРЫМАЦЬ ПАШПАРТЫ ГАТОЎНАСЦІ



*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Для папаўнення рыштунку выратавальных станцый і пастоў праводзіцца закупка абсталявання. Так, у распараджэнне ратавальнікаў у гэтым сезоне паступіць чатыры новыя аэралодкі. У планах — набыццё лодак-навігатараў, лодак «Беркут» і іншага абсталявання.

### З ВАДОЙ ЖАРТАВАЦЬ НЕ ВАРТА

Традыцыйна пляжы будуць гатовыя прыняць сваіх першых наведвальнікаў ужо ў першай палове мая, лічыць Кацярына Міхалёва. Гэта будзе, калі надвор'е нас не падвядзе і калі вада на вадаёмах канчаткова прагрэецца. Але да купальнага сезона трэба падрыхтаваць у першую чаргу маладых людзей, бо з вадой жартаваць не варта. Як заявіла Кацярына Міхалёва, з пачатку года ў краіне на вадзе загінулі 50 чалавек, з іх адно дзіця. За аналагічны перыяд мінулага года вада забрала жыцці 73 чалавек, траіх дзяцей. За гэты час работнікамі выратавальных службаў станцый і пастоў былі выратаваны 32 чалавекі, чацвёра — непаўналетнія.

Да месцаў для купання, якія перад пачаткам сезона абследуюцца спецыялістамі, існуюць строгія патрабаванні. Згодна з імі, дно акваторыі павінна быць роўным, шчыльным, са спадзістым спускам без уступаў глыбінёй не болей чым 1,75 метра, свабодным ад ціны і раслін, камянёў і іншародных цел. Максімальная глыбіня берагавой лініі павінна складаць 50 сантыметраў. Але і гэта яшчэ не ўсё. Абавязкова правяраецца хімічны і біялагічны стан вады, якой пры купанні можна глынуць ці нават наглытацца.

Адкрыццё пляжа з дазволам на купанне або без таксама суправаджаецца абавязковай пашпартызацыяй аб'екта. Дакумент выдаецца толькі тады, калі на пляжы маецца ўсё неабходнае абсталяванне і ён адпавядае ўсім санітарным нормам. Калі купанне ў дадзеным месцы не дазволена, то пляжная зона застаецца толькі месцам для прыняцця сонечных ваннаў.

У Мядзельскім раёне, напрыклад, устаноўлена дзесяць месцаў для купання, тады як месцаў адпачынку каля вады — больш як 30. Такім чынам, не ўсе месцы адпачынку падыходзяць для купання. «Часам вадалазныя абследаванні, якія ініцыіруюцца мясцовымі органамі ўлады, паказваюць у зоне дна акваторыі наяўнасць ключоў, ям або абрываў. Зразумела, што дазволу на купанне ў дадзеным вадаёме атрымана не будзе», — адзначыў **вядучы спецыяліст Мінскай абласной арганізацыі АСВОД Міхаіл ФРАЛОЎ.**

Ён таксама падкрэсліў, што летась з агульнай колькасці патанулых у Мінскай вобласці 13 чалавек знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Больш за тое, усе яны патанулі ў месцах, якія не былі прызначаныя для купання.

Дарэчы, за купанне ў забароненых месцах у выпадку ўстанаўлення такога факта да адпачывальнікаў могуць прымяніць адміністрацыйныя меры спагнання. Як і за распіццё спіртных напояў у месцах адпачынку каля вады, якія таксама з'яўляюцца грамадскімі месцамі.

Падрыхтоўка да купальнага сезона ў Мінскай вобласці, які традыцыйна пачынаецца 1 мая, ажыццяўляецца на падставе рашэння Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, у якім прапісваюцца як АСВОДам, так і мясцовымі органамі ўлады і службамі абавязковыя для выканання мерапрыемствы. Працэс падрыхтоўкі мае два напрамкі: праверка гатоўнасці сіл і сродкаў выратавальных станцый і ведамасных пастоў, а таксама непасрэдна пляжаў і месцаў для купання», — расказаў Міхаіл Фралоў.

На Міншчыне з пачаткам купальнага сезона адкрыецца 110 месцаў масавага адпачынку каля вады. Пры пераходзе на летні перыяд работы на выратавальных станцыях і пастах праводзіцца тэхнічнае абслугоўванне катэраў і лодак, закупляецца неабходнае абсталяванне.

«Нарошчваецца колькасць выратавальных пастоў. Усяго нашы пасты і станцыі закрываюць 99 месцаў адпачынку. Калі тры гады таму было 29 выратавальных пастоў, то ў 2024 годзе ўжо 57. Для нядаўна створаных цяпер закупляецца абсталяванне, ідзе фарміраванне штата. Акрамя таго, бяспеку людзей на вадзе забяспечваюць сем выратавальных станцый Мінскай АСВОД і дзве станцыі горада Мінска, размешчаныя ў Мінскім раёне на вадаёмах Пціч і Вяча», — адзначыў Міхаіл Фралоў.

Традыцыйна напярэдадні купальнага сезона праводзіцца тыдзень бяспекі на вадзе, які ахоплівае рабочыя калектывы і ўстановы адукацыі. У планах — узаемадзеянне з адміністрацыяй аздараўленчых лагераў, паблізу якіх ёсць вадаёмы. «Зараз мы рыхтуем каля дзесяці тысяч памятак для распаўсюджвання сярод адпачывальнікаў у лагерах. Яны таксама будуць раздавацца ў рамках рэйдаў, якія мы праводзім сумесна з МУС», — распавёў Міхаіл Фралоў.

Варта адзначыць, што ў Мінскай вобласці з пачатку года патанулі шэсць чалавек, сярод іх адзін непаўналетні, што ў два разы менш, чым за аналагічны перыяд летась.

«Калі аналізаваць больш раннюю статыстыку — у 2022 годзе на вадзе загінулі 70 чалавек, з іх трое дзяцей, — то мінулы год завяршыўся з лічбамі: 57 дарослых і адно дзіця. Нашымі ратавальнікамі-матросамі летась не дапушчана гібелі ў раёне дзеяння выратавальных пастоў і станцый. Такім чынам, работа, якая праводзіцца, у тым ліку і прафілактычная, дае свой плён», — адзначыў Міхаіл Фралоў.

### АЛЬТАНКІ І ТАПЧАНЫ

Дзіцячае і іншае спецыяльнае абсталяванне — на мінскіх пляжах да купальнага сезона абавязкова абновяць. Пра гэта расказала **начальніца службы ўтрымання гарадскіх лясоў, пляжаў і МКАД УП «Мінская лесапаркавая гаспадарка» Марына МАКАРАВА.**

«На балансе нашай арганізацыі — 20 пляжаў, размешчаных уздоўж чатырох вадасховішчаў — Цнянскага (5 пляжаў), Заслаўскага (8), Дразды (5) і Крыніца (2). Згодна з праграмай развіцця пляжаў, якая зацвярджаецца Мінскім гарвыканкамам, гэтыя пляжныя зоны замацоўваюцца за адміністрацыямі горада. Падчас падрыхтоўкі да купальнага сезона праводзіцца комплекс мерапрыемстваў. Гэта рамонт і афарбаванне дзіцячага і спартыўнага абсталявання, дэмантаж старога, рамонт пад'язных дарог і лясной мэблі, аўтастаянак, веладарожак і пліткавага пакрыцця», — расказала Марына Макарава.

Згодна з праграмай на 2024 год, месцы адпачынку абсталююць 20 новымі драўлянымі альтанкамі, дзесяццю сталамі з крэсламі, васьмю лаўкамі і інфармацыйнымі стэндамі. Усе драўляныя малыя формы выраблены сіламі Мінскай лесапаркавай гаспадаркі. Папоўніцца абсталяванне пляжаў і тапчанамі. Ужо ўстаноўлена 220 новых тапчаноў, з іх 110 на Заслаўскім вадасховішчы, бо яно нароўні з Цнянскім застаецца адным з самых папулярных месцаў адпачынку ў гараджан. Сёлета на іх з'явяцца новыя ценявыя павеці, кабінкі для пераадзявання, арэлі, урны, новыя мангалы. Часткова берагавая зона пляжаў будзе падсыпаная пяском першага класа.

Не менш важнае пытанне для месцаў масавага адпачынку каля вады — арганізацыя санітарных зон. Мінская лесапаркавая гаспадарка плануе ўстанавіць паблізу пляжаў 74 біяпрыбіральні, дзве з якіх для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

А вось адкрыццё пляжаў пройдзе з надыходам спрыяльнага для купання надвор'я. З практыкі мінулых гадоў, са слоў спецыяліста, гэта адбываецца ў другой палове мая.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# Мокры снег — гэта ўжо занадта

## З аўторка ноччу — да мінус аднаго, а ў суботу замаразкі — да мінус 3 градусаў

**На гэтым тыдні мы адзначалі сярэдзіну вясны. І калі першая палова месяца была па-летняму цёплай і па тэмпературным рэжыме на 6-7 градусаў вышэй за кліматычную норму, то ў найбліжэйшы час ініцыятыва будзе належаць цыклонам і іх атмасферным франтам, якія абумовяць у Беларусі няўстойлівае надвор'е. Разам з тым у краіну прадоўжыць паступаць халодная паветраная маса. Таму тэмпературны фон будзе паніжацца, а дапаўненнем да яго стануць ападкі рознай інтэнсіўнасці ў выглядзе дажджу, у асобныя дні з мокрым снегам і парывістым ветрам, расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Ужо сёння ўначы месцамі па захадзе, раніцай і днём у многіх раёнах краіны пройдуць дажджы. Удзень на захадзе месцамі ўзмацненне ветру парывамі 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 1 — плюс 5 градусаў, удзень — 9—14 градусаў з плюсам, а на поўдні краіны — да 16 градусаў цяпла.

Надвор'е пачне псавацца ўжо ў сераду. У гэты дзень месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 1 да плюс 6 градусаў, а ўдзень — ад плюс 7 градусаў на паўночным захадзе да 15 градусаў на паўднёвым усходзе краіны.

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, днём у чацвер месцамі па паўднёвым усходзе, а ў ноч на пятніцу ва ўсходніх раёнах ападкі будуць дастаткова моцныя.

У чацвер раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца ападкі (у асноўным дождж). Днём месцамі па паўднёвым усходзе пройдуць моцныя дажджы. Уначы слупкі тэрмометраў пакажуць мінус 1 — плюс 6 градусаў, удзень — 6—11 цяпла.

У пятніцу зноў да нас вернуцца халодныя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Яны будуць назірацца на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўначы па ўсходзе месцамі будуць моцныя. Ноччу і раніцай на асобных участках дарог — галалёдзіца. Месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы дасягне мінус 1 — плюс 6 градусаў, удзень — плюс 5—11 градусаў, на паўночным усходзе месцамі — толькі 2—4 цяпла.

Згодна з доўгатэрміновым прагнозам айчынных спецыялістаў, у суботу месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Ноччу і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ў межах ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а ўдзень — ад 6 да 13 цяпла. Будзе халадна і ў нядзелю, калі ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі прагназуюцца кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабыя туман і галалёд. Ноччу сіноптыкі абяцаюць мінус 2 — плюс 5 градусаў, па паўднёвым усходзе — да плюс 7 градусаў, днём — да 8—15 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**







# БУРШТЫНАВЫ ВЕКТАР І ПРАРЫЎНЫ ПРАЕКТ

## Старшыня Ваўкавыскага райвыканкама Міхаіл СІЦЬКО расказаў аб паездцы ў Калінінградскую вобласць і падрыхтоўцы да юбілейнай даты горада

***— Міхаіл Міхайлавіч, нядаўна ў складзе дэлегацыі Гродзеншчыны вы пабывалі ў бурштынавым краі — Калінінградскай вобласці. Была падпісана дамова аб намерах з расійскім раёнам. Што папярэднічала гэтаму?***

— Беларусь і Расія паспяхова працуюць у рамках Саюзнай дзяржавы. Летась у Гродне з удзелам калінінградцаў прайшлі мерапрыемствы ў рамках праекта «Расія — Беларусь» — моцнае партнёрства» пры грантавай падтрымцы Фонду імя Гарчакова. І вось нядаўна адбыўся працяг праекта. У Калінінградскую вобласць прыбыла дэлегацыя Гродзенскай вобласці. Падпісана шэраг пагадненняў з муніцыпальнымі раёнамі. Ваўкавыскі раён і Палеск таксама замацавалі свае намеры аб наладжванні двухбаковых сувязяў.

Трэба сказаць, што пабрацімскія сувязі ў нас наладжаны з горадам Гусеў Калінінградскай вобласці. Дэлегацыя на чале з кіраўніком адміністрацыі неаднаразова наведвала Ваўкавыск.

Цяпер мы вырашылі пашырыць рамкі супрацоўніцтва з расійскім рэгіёнам. Такім чынам зацікавіліся Палескам, выйшлі на кіраўніцтва з прапановай супрацоўніцтва, атрымалі падтрымку. Мы расказалі аб сваім раёне, знакавых мясцінах. Нашы партнёры асабліва зацікавіліся турыстычнай сферай, у прыватнасці магчымасцямі беларускай санаторна-курортнай базы. Мы заўважылі, што гэты кірунак сёння вельмі папулярны ў расіян.

Паколькі Палескі раён па большасці аграрны, расійскія партнёры праявілі цікавасць да нашых тэхналогій па сельскай гаспадарцы. Таксама азнаёміліся з нашымі малочнымі і мяснымі прадпрыемствамі. Адчуваецца, што кіраўнік раёна, які, дарэчы, заняў гэту пасаду нядаўна, скіраваны на актыўнае супрацоўніцтва.

***— Якім бачыце развіццё турызму з расійскімі партнёрамі?***

— У Ваўкавыскім раёне дзейнічаюць два ведамасныя санаторыі — «Энергетык» і «Пралеска». Іх аздараўленчая база даўно асвоена расійскімі турыстамі. Думаю, санаторыі зацікавяць і нашых калінінградскіх сяброў. Акрамя гэтага, яны змогуць пазнаёміцца з рознымі турыстычнымі маршрутамі, убачыць нашы знакамітыя Мальдзівы — былыя кар'еры цэментнага завода. З іншага боку, на Балтыку, у знакаміты бурштынавы край, змогуць паехаць і нашы групы.

***— Вы таксама згадалі інтарэс да беларускіх сельскагаспадарчых тэхналогій. Што тут маецца на ўвазе?***

— У Палеску пачынаецца будаўніцтва вялікага жывёлагадоўчага комплексу. А для таго, каб яго асвоіць, неабходна глыбока вывучыць тэхналогію малочнай вытворчасці — усе меры па ўтрыманні, даенні, кармленні, аднаўленні статка і гэтак далей. Мы можам падзяліцца вопытам. У сваю чаргу, нас зацікавіла іх работа па аднаўленні статка, там напрацавана даволі важкая база. Мы таксама бачым для сябе перспектыву ва ўдасканальванні галштынскай пароды. Яна даволі далікатная і патрабуе вельмі дакладнага маніторынгу на стадыі аднаўлення.

***— Ці вялася гаворка пра сумесныя праекты? Ведаю, што раней такія трансгранічныя праекты падтрымліваў расійскі Фонд імя Гарчакова. Ці накіравана грантавая падтрымка на беларуска-расійскі вектар?***

— Вядзецца работа па пераразмеркаванні сродкаў фонду. Магчыма, яны будуць накіраваны на сумесныя беларуска-расійскія праекты. Наш раён у гэтым таксама зацікаўлены, будзем прапаноўваць свае ідэі. Пачнём з культурных, адукацыйных, спартыўных, экалагічных тэм. Больш падрабязна зможам гэта абмеркаваць падчас візіту ў Гродзенскі рэгіён, які адбудзецца ў сярэдзіне мая. За гэты месяц падрыхтуем свой пакет прапаноў. Спадзяюся, што кіраўніцтва адміністрацыі Палеска наведае наш Ваўкавыск падчас прыезду Калінінградскай дэлегацыі.

***— Выходзіце на знешнія сувязі з іншымі краінамі?***

— Спадзяёмся, што ў хуткім часе пачне рэалізоўвацца праект з Кітаем па выпуску піратэхнічных сродкаў, феерверкаў. Дэлегацыя з КНР павінна да нас прыехаць у красавіку і нарэшце вызначыцца з далейшай рэалізацыяй праекта. Гэта справа ў Беларусі новая, але ў нас ёсць неабходныя ўмовы. У якасці складоў плануем задзейнічаць памяшканні былога ваеннага гарадка. Там будзе арганізавана і сама вытворчасць.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Раней феерверкі завозіліся з Еўропы, пазней — пастаўляў Кітай. Магчыма, у нас будзе створана сумеснае прадпрыемства. Тэма запатрабаваная, на гэту прадукцыю ёсць попыт.

***— Што сёння актуальна для саміх жыхароў Ваўкавыска?***

— Вырашаем пытанні аховы здароўя. Ідзе аднаўленне медыцынскай базы, яна пастаянна ўдасканальваецца. Многае зрабілі ў гэтым кірунку летась. Адрамантавалі ФАПы, купілі перасовачны ФАП, што павышае якасць абслугоўвання. Там на месцы чалавек зможа атрымаць пры неабходнасці накіраванне на дадатковае абследаванне ў раённай клініцы. Рыхтуем устаноўку ангіёграфа, які даследуе хваробы сасудаў. Аб'яўлены тэндар на мантаж абсталявання. Плануем да 1 мая здаць апарат у эксплуатацыю.

***— Ваўкавыск — горад прывабны для жыцця. Тут знаходзіцца шэраг буйных прамысловых аб'ектаў. А як ідзе будаўніцтва жылля?***

— Летась здалі два шматпавярховікі, сёлета таксама будзем здаваць шматкватэрны дом. Будаўніцтва вядзе самая буйная арганізацыя рэгіёна «Гроднажылбуд». Сустракаемся з людзьмі, прапануем ім варыянты, каб яны своечасова падрыхтавалі дакументы для атрымання кватэр. Таксама выдзяляецца жыллё для ваеннаслужачых і шматдзетных сем'яў.

***— Калі падвесці вынікі мінулага года, на чым бы вы акцэнтавалі ўвагу? Якія самыя значныя здабыткі?***

— Лічу, што мінулы год можна назваць прарыўным для Ваўкавыскага раёна. Мы паспяхова справіліся з вызначанымі планамі. Пачалі рэалізацыю вельмі істотнага інвестпраекта па перапрацоўцы цвёрдых бытавых адходаў з вытворчасцю РДФ-паліва. Праект плануецца рэалізаваць у рамках дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе». Рэалізацыя праекта дазволіць мінімізіраваць шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе, атрымаць альтэрнатыўнае паліва і стварыць новыя працоўныя месцы. Атрыманае такім чынам паліва будзе выкарыстоўвацца для вытворчасці цэменту на прадпрыемстве «Красносельскбудматэрыялы».

***— У будучым годзе Ваўкавыск адзначыць 1020-годдзе. Пачалі падрыхтоўку да адметнай даты?***

— Нядаўна ў нас адбылася сустрэча з губернатарам. Агучылі гэту тэму і выказалі прапанову правесці ў Ваўкавыску абласны фестываль «Дажынкі» ў наступным годзе. Такім чынам, мяркуем сумясціць два важныя мерапрыемствы і зладзіць глабальнае свята. Гэта было б самым маштабным падарункам як для нашых гараджан, так і для гасцей горада.

**Гутарыла Маргарыта УШКЕВІЧ.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Медыцына




# Дыяпазон дапамогі расце

## У міжраённым медыцынскім цэнтры ў Ваўкавыску пачне працаваць ангіяграфічны кабінет

**У Гродзенскай вобласці вызначаны тры раённыя цэнтры з апорнымі клінікамі, на абслугоўванні якіх 5-6 раёнаў. Ваўкавыск — адзін з такіх міжраённых цэнтраў. Цяпер тут знаходзіцца 430 ложкаў, з якіх больш паловы выкарыстоўваецца для лячэння пацыентаў з іншых раёнаў: Зэльвенскага, Слонімскага, Свіслацкага, Бераставіцкага, Мастоўскага і Шчучынскага. Медыцынская дапамога робіцца і на амбулаторным этапе. Агульная колькасць насельніцтва складае 225 тысяч чалавек.**



**Галоўны ўрач Алена ГРЫЦКЕВІЧ і загадчык кабінета МРТ Гражына ШАПЕЛЬ устанаўліваюць рэжымы ўвядзення кантраснага рэчыва ў кабінеце МРТ.**

Увядзенне новага корпуса бальніцы ў 2018 годзе дазволіла не толькі палепшыць даступнасць і якасць медыцынскіх паслуг, умовы ўтрымання пацыентаў, але і аб'яднаць медыцынскую ўстанову ў адзіны міжраённы цэнтр. Новая бальніца атрымала сучаснае рэнтген абсталяванне, ультрагукавыя прыборы.

У статусе міжраённай установы працуюць аддзяленне «Шлюб і сям'я», аддзяленні трансфузіялогіі, лапараскапічнай хірургіі. Дарэчы, 80 % халецыстэктамій праводзіцца менавіта лапараскапічным спосабам — гэта значыць без надрэзаў, з дапамогай праколаў.

Акрамя таго, функцыянуюць дыягнастычныя кабінеты, дзе праводзіцца дыягностыка пацыентаў з іншых раёнаў. Гэта кабінет МРТ, КТ, ПЛР-лабараторыя, цыталагічная лабараторыя, праводзіцца УГД-скрынінг цяжарных жанчын на базе жаночай кансультацыі.

Галоўны ўрач раённай бальніцы Алена Грыцкевіч засяроджвае ўвагу на новым дыягнастычным комплексе. У хуткім часе тут адбудзецца адкрыццё ангіяграфічнага кабінета. На сёння такія кабінеты ёсць толькі ў Гродне і Астраўцы.

— Клініка працягвае аднаўляцца, мы атрымалі ангіяграфічны апарат коштам амаль два мільёны рублёў. Апарат дасць магчымасць праводзіць даследаванне сасудаў, у тым ліку аказанне дапамогі людзям з вострым каранарным сіндромам, а таксама будзе выконвацца ангіяграфія сасудаў рознага віду, — зазначае галоўны ўрач бальніцы.

Патрэба ў апараце відавочная, кажа Алена Грыцкевіч. На сёння хваробы сістэмы кровазвароту займаюць першае месца ў прычынах смяротнасці і дасягаюць 54 %. Таму важна не толькі аказаць экстранную дапамогу, але і перабудаваць работу такім чынам, каб выяўляць пацыентаў з высокай кардыяваскулярнай рызыкай не пры вострым сіндроме, а ў планавым парадку. Цяпер іх можна будзе даследаваць падчас прыёму.

— Пры наяўнасці апарата мы будзем забяспечаны ўсім неабходным на сённяшні дзень для функцыянавання такой апорнай клінікі, — падкрэсліла галоўны ўрач.

Шырока запатрабаваны тут і міжраённы траўматалагічны цэнтр. Асабліва гэта датычыцца эндапратэзавання тазасцегнавых суставаў. Чарга на аперацыю ёсць пастаянна. Напрыклад, летась з мая па снежань было выканана пратэзаванне ўсім заяўленым пацыентам, а гэта каля 200 чалавек. Усе пратэзы закупляюцца праз Мінздраў.

Таксама за кошт сродкаў Міністэрства аховы здароўя ў клініцы набыты апарат магнітна-рэзананснай тамаграфіі, кошт якога склаў 2,5 мільёна рублёў. Яшчэ 1,5 мільёна выдаткавана раённым бюджэтам для рамонту кабінета. Амаль трэцяя частка даследаванняў на апаратах КТ і МРТ прыходзіцца на пацыентаў з іншых раёнаў, што сведчыць аб запатрабаванасці такой апорнай клінікі. Для больш шырокага ахопу насельніцтва арганізаваны два дапаўняльныя аддзяленні УГД-дыягностыкі і эндаскапіі. Апрацоўка ўсіх эндаскапічных вынікаў выконваецца толькі ў аўтаматычным рэжыме.

Не застаецца без увагі і сельскае насельніцтва. За апошні час адрамантаваны тры амбулаторыі ўрача агульнай практыкі, чатыры ФАПы і дзве бальніцы сястрынскага нагляду, на гэтыя мэты затрачана 101 тысяча рублёў. Летась закуплены перасовачны ФАП, які за паўгода аб'ехаў 115 вёсак.

Фінансаванне на аднаго жыхара за мінулы год у раёне склала больш за 700 рублёў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Захапленне

# І мадэлі, і дызайнеры

## Удзельніцы тэатра моды «Спадчына» з Ваўкавыска самі шыюць свае касцюмы

**Паўсотні непаўторных калекцый, дзясяткі тытулаў пераможцаў конкурсаў — такое партфоліа Заслужанага аматарскага калектыву Беларусі ўзорнага тэатра моды «Спадчына». Каля 20 гадоў працуе тэатр моды на базе Ваўкавыскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. Апроч пашыву адзення, удзельніцы калектыву авалодваюць харэаграфічным мастацтвам.**

— Наш калектыў незвычайны, ён не падобны на іншыя, — пачынае знаёмства з калектывам яго кіраўнік Ала Сурмінава. — Кожная ўдзельніца не толькі дэманструе сваё адзенне, але і сама яго шые. Ад мяне зыходзяць толькі ўстаноўка і нейкія эскізныя варыянты. І кожная дзяўчына пад сябе робіць сваю мадэль, але ў гармоніі з агульнай задумкай калекцыі.

Работа над калекцыяй не дапускае мітусні. Гэта працэс няспешны. Ад лякал да канчатковага выніку можа прайсці не адзін месяц. Акрамя гэтага, дзяўчаты наведваюць харэаграфічныя заняткі ў танцавальнай зале, якія вядзе Марына Рудзіеўская, харэограф тэатра. У адпаведнасці з калекцыяй падбіраецца музычны рэпертуар — альбо ў народным стылі, альбо сімфанічны, альбо эстрадны. Таксама адпрацоўваюцца рухі. Такім чынам, глядач не толькі бачыць унікальныя мадэлі адзення, але і ўспрымае іх як тэатральнае відовішча.

— Харэаграфічная пастаноўка павінна адпавядаць стылістыцы калекцыі, таму стараюся выбраць менавіта беларускую музыку са зразумелымі словамі і вядомай мелодыяй. Карыстаемся і класічнымі творамі, але павінна быць усё гарманічна, — заўважае харэограф.

Заняткі праходзяць па дзве гадзіны два разы на тыдзень. Плюс па два заняткі ў танцавальнай студыі.

Заўважаю, што ў партфоліа студыі нямала калекцый з саламянай апрацоўкай, прытым ёсць мадэлі, дзе саломка — гэта асноўны матэрыял. Узоры падбірае кожная ўдзельніца, што надае калекцыі такі разнастайны выгляд. Дарэчы, саломка патрабуе значнай папярэдняй работы. Для тэхнікі «аплікацыя» яе трэба размачыць, выпрастаць, наклеіць на паперу, а затым у ход ідуць нажніцы і ўласная фантазія.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Кіраўнік калектыву Ала СУРМІНАВА дэманструе калекцыю «Грацыі».**

— Тканіна і ўсе неабходныя дэталі закупляюцца Цэнтрам творчасці дзяцей і моладзі, на базе якога дзейнічае наш тэатр моды. На адну калекцыю ідзе да паўсотні метраў. За 20 гадоў намі створана 52 калекцыі. Усе яны захоўваюцца тут, у Цэнтры творчасці, — расказвае Ала Аляксееўна.

Асобная тэма калекцый — выцінанкі. Падступаліся да іх павольна. Пачыналі з невялікіх пано. Потым выцінанка пераносілася на тканіну, а затым ішло абпальванне. Так узніклі ўзоры з народнай тэматыкай: дрэва жыцця, пеўні, жывёлы, сонца, плыт, стог сена... Яшчэ ёсць калекцыі з прыгожымі вышыўкамі, з футравым аздабленнем, з макрамэ...

— Вы не знойдзеце ў нашых калекцыях ніводнага элемента, ніводнага аздаблення, купленага ў крамах. Усё поўнасцю зроблена ўручную, у тым ліку і галаўныя ўборы, — падкрэсліла кіраўнік студыі.

«Казкі малахітавай шкатулкі», «Каханачка», «Саламяныя карункі», «Крывічанка», «Вяснянка», «Белы сон», «Кветкі Беларусі», «Свята», «Беларускі сувенір», з апошніх — «Матулі родныя напевы». «Квецень», «Беларускія прыгажуні», «Грацыя» — далёка не ўвесь пералік калекцый тэатра моды «Спадчына». Новая калекцыя «Летуценніца» ўзяла ўдзел у міжнародным конкурсе «Творчасць без межаў» у Мінску і адзначана дыпломам І ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У гэтай калекцыі калектыў зноў звярнуўся да саломкі, прычым узоры звязаны з беларускай народнай сімволікай. Сама Ала Сурмінава — народны майстар па саломапляценні, таму многія калекцыі аздобленыя гэтым прыродным матэрыялам. А вось асновай мадэляў часта з'яўляюцца льняныя вырабы. «Вось гэта калекцыя заняла першае месца на міжнародным конкурсе «Творчасць без межаў» у мінулым годзе, вось гэтая — была найлепшай на папярэднім конкурсе. Ужо гадоў сем, мабыць, як мы атрымліваем перамогу», — з гонарам кажа кіраўнік тэатра-студыі, гартаючы альбом-партфоліа». — У мадэлях з саломкай мы пастаянныя пераможцы, бо кожны раз прапануем новую тэхніку выканання».

Незвычайны калектыў даўно заўважылі беларускія выканаўцы. І Саша Нэма, і Тэа, і Ірына Дарафеева падчас выступлення ахвотна бяруць для суправаджэння тэатр моды «Спадчына». Выканаўца з Масквы Дзмітрый Кароль на канцэрце ў гонар 8 Сакавіка выканаў песню з удзелам ваўкавыскага калектыву. У красавіку «Спадчына» выступіць у Палацы Рэспублікі падчас справаздачнага канцэрта Гродзенскай вобласці.

«А як наконт новай калекцыі?» — цікаўлюся на заканчэнне. «Гэта сакрэт, — смяецца Ала Сурмінава. — Магу толькі паказаць частковыя элементы, але фатаграфаваць нельга. У яе яшчэ нават назвы няма». Кіраўнік дадала толькі, што новая калекцыя не падобная на ўсе папярэднія як па стылі, так і па колеры. Можна не сумнявацца, што гэта будзе чарговы дызайнерскі цуд ад удзельніц тэатра моды «Спадчына».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Вольны час

# ВЫПРАБАВАННЕ ЭКСТРЫМАМ

## У Ваўкавыскім цэнтры творчасці дзяцей і моладзі расце захапленне спартыўным турызмам

**Спартыўная зала ніколі тут не пустуе. Асаблівы наплыў назіраецца ў другой палове дня, калі школьнікі пасля заняткаў спяшаюцца на трэніроўкі. Турысцка-прыкладное мнагаборства ахоплівае даволі значнае кола аматараў. У аб'яднаннях па інтарэсах цэнтра займаюцца 375 чалавек. У скарбонцы юных турыстаў — перамогі ў абласных, рэспубліканскіх і нават міжнародных спаборніцтвах.**

Між тым педагогі не ставяць канкрэтнай задачы выхаваць прафесіянальных спартсменаў. Вядома, тытул чэмпіёнаў таксама не здымаецца з павесткі дня. Разам з тым тут імкнуцца падрыхтаваць дзяцей да будучага жыцця, зрабіць іх вынослівымі, фізічна актыўнымі, навучыць пераадольваць цяжкасці. Таму прыйсці сюды могуць хлопчыкі і дзяўчынкі любога школьнага ўзросту.

Спартыўная зала абсталявана адпаведна. Па ўсёй плошчы размешчаны вяровачны парк, а сцяна прыстасавана пад скаладром. Педагог дадатковай адукацыі Павел Махамет зазначае, што кожны школьнік можа выбраць сабе заняткі па гусце. Хтосьці больш увагі надае спартыўнаму скалалажанню (якое, дарэчы, з'яўляецца алімпійскім відам спорту), а хтосьці засяроджаны на асваенні навыкаў турысцка-прыкладнога мнагаборства. Многіх прыцягвае менавіта той факт, што спаборніцтвы праходзяць на прыродзе. Гэта яшчэ адна асаблівасць і саміх заняткаў — на трэніроўкі ўдзельнікі гуртка адпраўляюцца з палаткамі ў лясныя пушчы.

— Мы стараемся трымаць спартыўны кірунак. Таксама дзеці атрымліваюць навыкі пражывання ў палявых умовах, у тым ліку вучацца, як гатаваць ежу. Агульная фізічная падрыхтоўка цяпер вельмі важная для падлеткаў, гэта іх загартоўвае, аздараўлівае, — упэўнены Павел.

Педагог лічыць важным, калі спартыўныя намаганні прыносяць плён. Гэта дадатковы стымул для станаўлення і развіцця асобы сённяшніх падлеткаў. Выяўляюцца лідарскія якасці, уменне працаваць у камандзе, стойкасць у дасягненні мэты. Так, летась на абласных спаборніцтвах каманда Ваўкавыскага раёна 32 разы займала першае месца, больш як 40 разоў была ў ліку прызёраў. На рэспубліканскіх спаборніцтвах былі першымі 11 разоў, яшчэ 13 — займалі другое і трэцяе месцы. У злёце Саюзнай дзяржавы былі другімі па спартыўным арыентаванні.

Адным з самых запатрабаваных відаў з'яўляецца спартыўнае скалалажанне. А як наконт страху вышыні? Многім даволі складана справіцца з гэтым пачуццём. Павел Махамет не пагаджаецца. Аказваецца, гэта не самае складанае ў пад'ёме ўгору. Дастаткова некалькі разоў паспрабаваць — і страх сам сабой праходзіць. Тут важна размеркаваць сілы. Пачынаць на скаладроме трэба з невялікай вышыні, азірнуцца, потым падцягнуцца яшчэ на паўметра. І так паступова дасягнуць вяршыні. Літаральна праз месяц многія ўжо не памятаюць аб сваіх былых страхах.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Выхаванцы аб'яднання па інтарэсах «Юныя скалалазы» падчас заняткаў.**

Па словах дырэктара Ваўкавыскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Іны Кулак, скаладром карыстаецца вялікай папулярнасцю ў дзяцей. Калі яго ўладкавалі, колькасць аб'яднанняў значна павялічылася. Дарэчы, існы скаладром можна разабраць і перанесці, напрыклад, на сцяну будынка, што робіцца падчас гарадскіх свят. Такой канструкцыі няма больш ні ў адным раёне вобласці.

Развіваецца ў цэнтры творчасці і велатурызм. Гэта вельмі малады кірунак — гурток працуе толькі трэці год, але ўжо заявіў аб сабе як перспектыўны. Велапаходы захапляюць падлеткаў. Як расказаў педагог дадатковай адукацыі Яўген Бусловіч, летась яго выхаванцы праехалі 170 кіламетраў, а сёлета за восем дзён «накруцілі» ажно 300. Маршрут распрацоўваецца загадзя. Тут улічваецца і культурная праграма: наведваюцца музеі, помнікі, розныя славутасці. Сёлета, напрыклад, у паходзе пабывалі 18 школьнікаў — сярэдняга і старэйшага ўзросту. Дарэчы, усе яны павінны самі везці свае палаткі, рыштунак, спраўляцца з тэхнічнымі непаладкамі сваіх веласіпедаў. Улетку школьнікаў таксама чакаюць новыя паездкі і спартыўныя спаборніцтвы. А неабходную тэхнічную падрыхтоўку забяспечвае адукацыйная ўстанова па арганізацыі вольнага часу. Прычым абсалютна бясплатна.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# НА КАНТРОЛІ — КАРМАВАЯ БАЗА

## Як нарошчвае свой патэнцыял сельгаспрадпрыемства «Племзавод «Рось»




**Гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні племяннога статка чорна-стракатай пароды з высокім генетычным патэнцыялам. Ёсць свой цэх па вытворчасці камбікармоў. За мінулы год тут атрымалі ў сярэднім 9 тысяч кілаграмаў малака ад каровы. Дзякуючы стабільнай кармавой базе, развіваецца інтэнсіўная жывёлагадоўля. На працягу многіх гадоў КСУП « Племзавод «Рось» займае лідарскія пазіцыі ў Ваўкавыскім раёне, прымае ўдзел у міжнароднай выстаўцы «Белагра» і займае прызавыя месцы ў конкурсе на найлепшую племянную карову малочнай пароды.**

**Дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Племзавод «Рось» Віктар ЗАМІРОЎСКІ** расставіў акцэнты ў дзейнасці гаспадаркі.

***— Віктар Антонавіч, кармавая база сёння на асаблівым кантролі. Для вас як кіраўніка племяннной гаспадаркі такі падыход заўсёды быў актуальны. Нічога не мяняецца?***

— Мы традыцыйна вельмі сур'ёзна падыходзім да стварэння кармавой базы для жывёлагадоўлі. Таму асновай для нарыхтоўкі кармоў з'яўляецца кукуруза на сілас, якая займае 1200 гектараў. Гэта значныя пасяўныя плошчы нашай гаспадаркі. Таксама важнае значэнне надаём шматгадовым травам, пад іх адведзена яшчэ 1300 гектараў. Здымаем некалькі ўраджаяў. Сеем у асноўным люцэрну. Гэта багатая бялком культура дае добры вынік у прадукцыйнасці статка. У дзень доім 25 літраў малака на карову, па гаспадарцы маем 60 тон. І працягваем плюсаваць.

У цэлым бачым, што кукуруза на сілас і люцэрна на сянаж — адны з самых рэнтабельных культур для вытворчасці прадукцыі жывёлаводства. Кармамі мы забяспечаны на ўвесь сезон, заўсёды маем запасы да новага ўраджаю. Паколькі таварная жывёлагадоўля займае ў структуры выручкі 70 %, кармам тут надаецца асаблівая ўвага. Напрыклад, першы ўкос неабходна пачаць своечасова і правесці за 7—10 дзён. Таксама правільна закласці сянаж, каб у ім захоўваліся карысныя рэчывы, бялок, які патрэбны для прадукцыйнасці статка.

***— Асноўны прыбытак, вядома, складае прадукцыя жывёлагадоўлі?***

— Так, гэта продаж і малака, і мяса. У мінулым годзе надой на адну карову склаў звыш 9 тысяч кілаграмаў малака. Агульная вытворчасць — 21 тысяча тон. Больш чым у два разы нарасцілі аб'ёмы за апошнія гады. Гэта звязана таксама з мадэрнізацыяй жывёлагадоўчага комплексу. Тут атрымліваюць палову малочнай вытворчасці прадпрыемства. Гэта больш чым некалькі суседніх гаспадарак. Усё малако прадаецца гатункам «экстра». Для таго каб дасягнуць такога выніку, праведзены комплекс мерапрыемстваў, у тым ліку па селекцыі, ветэрынарнай медыцыне.



Дырэктар Віктар ЗАМІРОЎСКІ і галоўны аграном Андрэй РАКУЦЬ вывучаюць развіццё рапсу зімовага.

Сёння ў нас восем ферм, дзе ўтрымліваецца каля сямі тысяч галоў буйной рагатай жывёлы чорна-стракатай пароды. За кошт прыбытку можам развівацца. За апошні год адрамантавалі восем будынкаў для ўтрымання жывёлы. Таксама думаем і аб іншых інвестыцыйных праектах. Ёсць магчымасць пашырыць статак і больш пастаўляць на рынак прадукцыі жывёлагадоўлі. Таму для нас так важна атрымаць якасныя кармы ў патрэбным аб'ёме.

***— На што яшчэ робіцца стаўка ў гаспадарцы?***

—Добрая рэнтабельнасць у рапсу, буракоў, зерня. Гэта прадукцыя таксама запатрабавана. Летась мы атрымалі больш чым 45 мільёнаў выручкі за год. А вось сёлета сітуацыя іншая. У параўнанні з мінулым годам выручка за малако знізілася. Цэны падаюць. Мы выконваем у асноўным сацыяльную функцыю — пастаўляем сыравіну для вытворчасці прадуктаў харчавання. На сёння рынак вызначае канкурэнтаздольнасць нашай прадукцыі.

***— Ці ёсць якія-небудзь рэкамендацыі для гаспадарак?***

— Сёння варта думаць аб тым, каб сельская гаспадарка захавалася і праз пяць, і праз дзесяць гадоў. Гэта стратэгічная задача. Трэба праводзіць работу па паляпшэнні ўмоў працы, каб сённяшнія школьнікі маглі бачыць сябе ў сельскай гаспадарцы. Бо калі сорак гадоў таму ў Савецкім Саюзе востра стаяла пытанне харчовай бяспекі, паўсюдна вялася інфармацыйная і агітацыйная работа, гучалі заклікі «выканаем харчовую праграму». Тады ўрадам прымаліся беспрэцэдэнтныя меры для таго, каб зацікавіць людзей. Сёння сельская гаспадарка павінна дбаць аб сваіх кадрах, бо ўжо цана пытання іншая. І дбаць варта не толькі пра маладых спецыялістаў, але і пра ўсіх. А зрабіць гэта можна толькі пры фінансавым дабрабыце кожнага сельгаспрадпрыемства.

## «ВЯЛІКАЕ МАЛАКО» — АД ПОЛЯ ДА ФЕРМЫ

### Як агульныя намаганні працуюць на канчатковы вынік

Палова дойнага статка сельгаспрадпрыемства ўтрымліваецца на малочнатаварным комплексе «Дубаўцы». Гэта самая буйная ферма «Племзавода «Рось». Па словах начальніка комплексу Людмілы Шчыкачыхінай, высокія надоі забяспечваюцца высокім патэнцыялам, селекцыйнай работай, захаванасцю прыплоду, кармавой базай. Важна ўсё: як спрацуе спецыяліст, як падрыхтуе да ацёлу, як даглядаюць цялятніцы. На гэта звяртаецца самая пільная ўвага. Па словах начальніка комплексу, тут працуюць вельмі адказныя жывёлаводы, якія сочаць за тым, каб цяляты не хварэлі і дадавалі ў вазе. Гэта адзін з асноўных паказчыкаў здаровага цяляці.



Начальнік МТК «Дубаўцы» Людміла ШЧЫКАЧЫХІНА ў цялятніку.

Калі адкрывалі комплекс шэсць гадоў таму, надоі складалі 19–20 літраў. Цяпер тут атрымліваюць па 26-27 літраў малака ад каровы. Але ёсць рэкардсменкі, чые надоі дасягаюць і 50 літраў. Такія прадукцыйныя рагулі пад асаблівым наглядам. Яны пастаянныя ўдзельніцы і неаднаразовыя прызёры выстаўкі «Белагра».

— Калі мы запаўнялі комплекс, закуплялі цялушак з іншых гаспадарак. Да таго ж асемяняем кароў толькі іх асобнымі быкамі, у кожнай каровы — свой бык. Гадуем бычкоў на элевер. Іх мамы з высокімі надоямі, што павялічвае прадукцыйнасць будучых пакаленняў. Таксама клапоцімся аб тым, каб нашы рагулі мелі працяглы прадукцыйны ўзрост, — кажа Людміла Шчыкачыхіна.

## Жаўрук і палявая «ўверцюра»

### Што радуе на веснавых работах галоўнага агранома Андрэя РАКУЦЯ

Так супала, што падчас сяўбы над полем зашчабятаў жаўрук. «Ужо шмат птушак прыляцела з выраю: і жаўрукі, і буслы, і журавы. Вясна сёлета ранняя, сяўбу завяршылі на пачатку красавіка. Цяпер важныя для глебы вільгаць і цяпло. Гэта адыграе сваю пазітыўную ролю. У нас на 300 % закрыты насенны фонд, мы можам засеяць палі яшчэ дзвюх гаспадарак», — заўважае аграном, аглядаючы пасевы.

Андрэй Ракуць задаволены сёлетняй пасяўной. Спадзяецца, што ячмень дасць добры ўраджай. Гэта адна з самых рэнтабельных культур. У першую чаргу забяспечваецца дзяржзаказ — 350 тон, частка прадаецца на бровар, частка застаецца на кармы.

Трактарыст-машыніст Віктар КОЗЕЛ, вадзіцель Юрый МАЛЕЙ і брыгадзір вытворчай брыгады ў раслінаводстве Віктар ПІВАВАРЧЫК абмяркоўваюць вытворчыя пытанні на полі каля вёскі Вехатніца.



— Эксперыментуем з рознымі сартамі, шукаем, што лепшае, з-за гэтага застаецца шмат насення. Усё закупляем: і сваё, і імпартнае. Добра сябе паказаў французскі сорт «Уверцюра», таксама нядрэнныя сарты «Мустанг», беларускі «Бровар». Яны піўныя, — тлумачыць аграном.

Па абодвух баках свежага ворыва зеленеюць азімыя ўсходы. Па ўсім відаць, што перазімоўка прайшла ўдала. Па словах Андрэя Ракуця, летась пасяўныя плошчы пад азімы ячмень павялічылі. Добра ўзышлі азімыя пшаніца і трыцікале. А чым раней расліны выходзяць з зімоўкі, тым больш атрымліваюць пажыўных элементаў, адпаведна, больш стымулу для далейшага росту. Напрыклад, летась тут сабралі 66 ц/га зерневых і зернебабовых культур. Сёлета таксама патэнцыял на ўраджай. Такому становішчу садзейнічае і ранняя вясна.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 500029455

## Усё ведае... дыспетчар

**Больш за 30 гадоў працуе ў аператыўным пункце інфармацыі Ганна СУДНІКЕВІЧ.**

Мы засталі старшага дыспетчара за справаздачай з фермаў. Канчатковы вынік паступіць пасля апошняй дойкі. Але і цяпер жанчына ўпэўнена: вынік будзе добры. У сярэднім атрымліваецца 26 літраў на карову.

— Усё развіццё прадпрыемства ішло на маіх вачах, — кажа дыспетчар. — Значны рывок адбыўся пасля прыходу на племзавод Віктара Заміроўскага. Да яго надоі былі 12 літраў на карову ў дзень, а цяпер удвая больш.



Старшы дыспетчар Ганна СУДНІКЕВІЧ прымае справаздачу па вытворчасці малака.

Аператыўная інфармацыя асабліва важная падчас палявых работ: колькі ўзаралі, засеялі, колькі ўнесена арганікі на палі, на якім участку працуе той ці іншы механізатар, якія работы выконвае. Калі трэба кагосьці знайсці, звяртаюцца сюды.

— Уся аператыўная інфармацыя перадаецца вышэйшым інстанцыям па ўсіх кірунках. Інфармацыя патрэбна для таго, каб кіраваць працэсам, — зазначае Ганна Суднікевіч. — Каб прымаць правільныя рашэнні, трэба ведаць абстаноўку.

Дыспетчар рыхтуе поўную справаздачу да кожнай планёркі, якая праходзіць штодзень а палове сёмай раніцы. Дырэктар бачыць карціну дзейнасці прадпрыемства за мінулы дзень і, зыходзячы з гэтага, можа планаваць заданні на дзень сённяшні. Такая аператыўнасць дазваляе аптымальна скарэкціраваць заданні і адрэгуляваць пытанні ва ўсіх сферах дзейнасці.



# ЖКГ ВАЎКАВЫСКАГА РАЁНА БУДЗЕ ПА-НОВАМУ ВЫРАШАЦЬ ПРАБЛЕМУ СМЕЦЦЯ

## Тут пачалося будаўніцтва буйнога завода па перапрацоўцы цвёрдых бытавых адходаў

**У сферы дзейнасці жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна каля паўсотні відаў паслуг. На абслугоўванні прадпрыемства знаходзіцца амаль увесь жыллёвы фонд Ваўкавыскага раёна. Тут выконваюцца ўсе паказчыкі, якія даведзены дзяржаўнай праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе».**
**А нядаўна ў КУП «Ваўкавыская жыллёвая камунальная гаспадарка» шчыльна заняліся вырашэннем адной з самых злабадзённых праблем — перапрацоўкай камунальных адходаў. Аб тым, як праходзіць рэалізацыя аднаго з самых буйных інвестпраектаў раёна, расказала начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела ЖКГ Ваўкавыскага раёна Вольга РАЗДОРАВА.**

### ЧАМУ ПАТРЭБНЫ ЗАВОД

Не будзе перабольшваннем сказаць, што будаўніцтва завода па перапрацоўцы адходаў дыктуе сам час. Аб'ёмы смецця штогод растуць. І хоць збор другаснай сыравіны таксама павялічваецца, праблема адходаў застаецца актуальнай. Праўда, важна адзначыць той факт, што колькасць агульных сметнікаў істотна знізілася.

— У раёне не засталося міні-палігонаў. Мы выканалі распараджэнне Міністэрства ЖКГ аб іх татальным закрыцці. Такім чынам, на працягу пяці гадоў у нас закрыта шэсць міні-палігонаў. Цяпер дзейнічае адзін рэгіянальны палігон «Азярыска». Ён будзе пашырацца. Праектна-каштарысная дакументацыя ў сувязі з гэтым ужо распрацавана, выдзелены дадатковы ўчастак, — паведаміла Вольга Раздорава.

Гэта сведчаць аб тым, што горы смецця растуць. Таксама варта больш увагі надаваць збору другаснай сыравіны — значная іх частка па-ранейшаму трапляе на палігон. Існуючая лінія сартавання не паспявае за ростам камунальных адходаў. Таму значная іх частка па-ранейшаму трапляе на палігон. Ёсць і праблема ўтварэння стыхійных звалак. Яны выяўляюцца падчас сумесных рэйдаў з санітарнымі і прыродаахоўнымі службамі. Новы завод павінен кардынальна палепшыць сітуацыю.



Галоўны інжынер выконваючы абавязкі дырэктара Валерый МЕХАНОШЫН і намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Валянцін БУЙКО.

### ПРАЕКТ У РАБОЦЕ

Ідэя будаўніцтва завода звязана са стварэннем так званых рэгіянальных цэнтраў па абыходжанні з цвёрдымі бытавымі адходамі. Агульная канцэпцыя была распрацавана яшчэ пяць гадоў таму. Згодна з ёй, у Гродзенскай вобласці створаны два такія цэнтры — у Гродне і Ваўкавыску. Кожны цэнтр павінен мець свой перапрацоўчы завод. У Гродне ён ужо дзейнічае, а вось у Ваўкавыску толькі будуецца.

— У нашым раёне распрацавана перспектыўная схема па абыходжанні з адходамі для шасці суседніх раёнаў вобласці. Схема прадугледжвае поўны цыкл абыходжання з камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі. Гэта збор, вываз, сартаванне і перапрацоўка, — тлумачыць Вольга Раздорава.

У схеме важнае месца адводзіцца непасрэдна новаму прадпрыемству. Гэта даволі маштабны праект, за рэалізацыю якога тут узяліся летась. Для будаўніцтва адведзены ўчастак плошчай 8 гектараў. Тэрыторыя прымыкае да рэгіянальнага палігона адходаў. Дзякуючы сродкам Дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» на сёння ў поўным аб'ёме распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя, праект прайшоў будаўнічую і экалагічную экспертызы.

Як расказала спецыяліст раённага ЖКГ, непасрэдныя работы пачаліся тут у кастрычніку мінулага года. Была ачышчана тэрыторыя, пракладзены інжынерныя сеткі. Дарэчы, электрычны кабель з-за вялікай магутнасці цягнулі з Ваўкавыска, яго даўжыня склала ажно 12 кіламетраў. Распрацавана вертыкальная планіроўка пляцоўкі. У мінулым годзе асвоена больш за 8 мільёнаў рублёў.

Асноўныя контуры будучага завода пацiху праяўляюцца. Вядуцца работы нулявога цыкла — закладваецца фундамент вытворчага корпуса і бетонная аснова пад корпус біялагічнай сушкі. Асаблівая ўвага — адводу сцёкаў. Дзеля гэтага па-за пляцоўкай пракладзены камунальныя сеткі, па якіх сцёкі паступяць з ачышчальных збудаванняў у меліярацыйны канал, які знаходзіцца за два кіламетры ад завода.

Часткова закуплена тэхналагічнае абсталяванне.

Да канца года тут плануюць асвоіць каля 38 мільёнаў рублёў. А поўны кошт будаўніцтва складае 170 мільёнаў. Асноўная крыніца фінансавання — Дзяржаўная ўстанова «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў». Сродкі ўстановы паступаюць на спецыяльны разлік ад вытворцаў упакоўкі. За кошт «Аператара» таксама фінансуюцца іншыя экалагічныя праекты, у тым ліку інфармацыйная работа на тэму аховы прыроды.

### ПАЛІВА ДЛЯ ЗАВОДА-ГІГАНТА

По словах Вольгі Раздоравай, базавая камплектацыя завода будзе складацца з перапрацоўкі цвёрдых камунальных адходаў і вытвочасці RDF-паліва.



Начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Вольга РАЗДОРАВА.

— RDF-паліва будзе паступаць на самае буйное прамысловае прадпрыемства раёна — ААТ «Краснасельскбудматэрыялы», якое знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці ад горада. Гэта альтэрнатыўнае паліва. Яно можа выкарыстоўвацца толькі ў цэментных печах з вялікай тэмпературай гарэння, тады шкодныя рэчывы знікаюць, а не трапляюць у паветра. Там ужо пабудавана лінія па выкарыстанні гатовага паліва. Падлічана, што для яе эфектыўнай работы патрабуецца 120 тысяч тон. Наш завод па перапрацоўцы адходаў будзе пастаўляць значную долю — 105 тысяч тон, яшчэ 15 павінен забяспечыць гродзенскі завод. Такім чынам, абодва заводы будуць пакрываць патрэбу «Краснасельскбудматэрыялаў» у RDF-паліве і амаль поўнасцю заменяць паліўныя рэчывы, якімі цяпер карыстаецца завод, — расказала спецыяліст ЖКГ.

Дарэчы, на новым заводзе распрацаваны тэхнічныя ўмовы на тры віды RDF-паліва, якія адрозніваюцца па складзе. Гэта англійскі тэрмін, перакладаецца як паліва, якое атрымана з адходаў. Дык адкуль будзе паступаць сыравіна для яго? І што яна сабой уяўляе? Гэта пытанне таксама распрацавана загадзя. Па словах суразмоўцы, крыніцай паступлення будуць адходы сартавання як самога раёна, так і іншых пяці, што ўваходзяць у склад рэгіянальнага цэнтра. Мяркуецца, што сюды таксама будзе завозіцца каля 170 тысяч тон смецця з Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. У канчатковым выглядзе паліва будзе мець форму брыкета альбо насыпной крошкі.

### ЭФЕКТ ЭКАЛАГІЧНЫ І ЭКАНАМІЧНЫ

Падлічана, што адна тона RDF-паліва замяняе каля 0,75 тоны вугля.

Увогуле, чакаецца значнае паляпшэнне экалагічнай сітуацыі. У першую чаргу гэта датычыць шасці раёнаў рэгіянальнага цэнтра аб звароце камунальных адходаў. Павялічыцца ахоп насельніцтва яго зборам.

Поўны аб'ём перапрацоўкі змешаных адходаў разлічаны на 250 тысяч тон у год, з іх 85 тысяч тон будуць паступаць ад насельніцтва шасці раёнаў, 173 тысячы тон — адходы сартавання з іншых комплексаў.

— Мэта завода — уцягванне максімальнай колькасці адходаў у гаспадарчы абарот. Зразумела, што другасныя матэрыяльныя рэсурсы здаюцца на перапрацоўку. Значная частка цвёрдых бытавых адходаў мае арганічны складнік, іх можна выкарыстоўваць як кампост для азелянення тэрыторый — пры пасадцы дрэў, газонаў, кветнікаў, адсыпцы абочын дарог. Магчыма, у будучыні з'явіцца магчымасць адкрыць участак па выпуску палімерна-пясчаных і гумавых вырабаў, напрыклад, тратуарнай пліткі і гумавага пакрыцця. Такія ідэі таксама разглядаюцца на перспектыву, — паведаміла Вольга Раздорава.

Сёння перад камунальнай службай стаіць задача закупкі кантэйнераў для забудоў прыватнага сектара. Як правіла, іх павінна быць па два на кожным падворку. Каб забяспечыць парэбу ў кантэйнерах, іх трэба набыць каля 70 тысяч.

### ПЛЮС САРТАВАННЕ

Акрамя вытворчасці РДФ-паліва, на новым заводзе будзе працаваць лінія па сартаванні адходаў. Пакуль сістэма іх збору не вядзецца адпаведным чынам. Насельніцтва не вельмі заклапочана сартаваннем, таму вялікі працэнт смецця пастурае ў агульны кантэйнер і адвозіцца адразу на палігон. Там частку другаснай сыравіны сартуюць, але гэта работа не сістэмная.

Пасля таго, як завод уступіць у дзеянне, усе адходы будуць раздзяляцца на фракцыі. Усё будзе ісці паасобку: і шкло, і пластык, і арганічныя рэчывы. А вось рэшткі ад таго, што застанецца, якраз і будуць складаць сыравіну для RDF-паліва.

Мяркуецца, што завод будзе пушчаны ў эксплуатацыю ў 2026 годзе.

Дарэчы, у Беларусі ёсць перапрацоўчы завод у Оршы, завяршаецца будаўніцтва ў Бабруйску, пачалося ўзвядзенне ў Гомелі. Але там прадугледжаны толькі лініі сартавання. А вось выпуск RDF-паліва будзе весціся толькі на новым заводзе ў Ваўкавыску і дзеючым заводзе ў Гродне. Праўда, аб'ём паліва ваўкавыскага завода будзе амаль у 10 разоў большы.



Брыгадзір-бетоншчык Андрэй ЯРЭМІЧ выконвае ўстаноўку шчытавой апалубкі.



Прараб УП «Цэмбуд» Віктар БУЛАЙ вывучае генеральны план будоўлі рэгіянальнага комплексу па абыходжанні з ЦКА ў Ваўкавыскім раёне.



Будаўніцтва корпуса біялагічнай сушкі.

УНП 500042135.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# Арыентацыя на смак і якасць

## Сёлета ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат» адзначыць 60-гадовы юбілей

*Прадпрыемства на працягу дзесяцігоддзяў з'яўляецца адным з самых інавацыйных і высокатэхналагічных мясакамбінатаў Беларусі. Тут трымаюць руку на пульсе часу і робяць усё, каб задаволіць спажывецкі рынак. Толькі летась было запушчана 60 найменняў новай прадукцыі.*

***Увогуле тут вырабляецца каля 300 найменняў мясной прадукцыі. Трэцяя частка — гэта паўфабрыкаты. У іх ліку лінейка стэйкаў, паўфабрыкаты хуткага прыгатавання: філе, грудзінка, шынка, рабрынкі. Пашырылі асартымент шашлыкоў з рознымі марынадамі. Асартымент рэгулярна аднаўляецца і можа задаволіць попыт шырокага кола спажыўцоў. З прыходам новага генеральнага дырэктара Вольгі Янушка тут заняліся рэбрэдынгам прадпрыемства, змяніўся яго лагатып, пачалася татальная мадэрнізацыя вытворчасці.***

***Па словах начальніка аддзела маркетынгу і рэкламы Віталя Алешкі, прадпрыемства ўпэўнена трымае марку якасці і з'яўляецца пераможцам штогадовых рэспубліканскіх конкурсаў «Лідар галіны», «Народная марка», «Выбар года», «Чэмпіён смаку» і іншых. На конкурсе «Прадукт года — 2023» Ваўкавыскі мясакамбінат удастоены Гран-пры за сервелат «Шарбон». Найлепшымі прадуктамі прызнаныя пастрама «Юбілейная новая», каўбасы «Пармская», «Доктарская» і сасіскі «Троіцкія».***



### «Мы будзем змагацца за атрыманне знака якасці»

**Намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці і якасці ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат» Аляксандр ГЕСЬ** упэўнены ў канкурэнтаздольнасці прадукцыі, фундамент якой быў закладзены шмат гадоў таму. А вось аб'ёмы і асартымент за гэты час значна выраслі.

***— Аляксандр Раманавіч, сёння вытворчыя пазіцыі прадпрыемства складана параўнаць з пачаткам яго дзейнасці?***

— Наша гісторыя бярэ пачатак з 1964 года, і да кожнай юбілейнай даты падводзіцца пэўны вынік. Напрыклад, на старце мы выпускалі ў змену 6,5 тоны каўбасных вырабаў, цяпер гэта лічба павялічылася ў некалькі разоў і складае 28 тон. Вытворчасць мяса таксама павялічылася ў два разы. Тэмпы нарошчваліся, дзякуючы тэхнічнаму пераабсталяванню завода. Такім чынам ішло паляпшэнне якасці прадукцыі, павялічваўся асартымент.

Зараз работа па мадэрнізацыі вытворчасці працягваецца. Укараняюцца рэсурсазберагальныя тэхналогіі, якія дазваляюць рэгуляваць кошт.

***— У вас будуюцца новыя карпусы, добраўпарадкоўваецца тэрыторыя. Гэта, мабыць, працэс няспынны...***

— Летась мы завяршылі адзін з этапаў рэканструкцыі прадпрыемства. Быў здадзены ў эксплуатацыю склад гатовай прадукцыі, і цяпер на вызваленай плошчы вядуцца работы па тэхнічным пераўзбраенні. Гэта дазволіць пашырыць магчымасці па спажывецкай упакоўцы і прадставіць нашу прадукцыю ў шырокім асартыменце, бо спажывец заўсёды чакае навінак.

***— Мабыць, многія звярнулі ўвагу на ваш новы лагатып. Магчыма, новы адносна, бо ён існуе больш года. Як працуе рэбрэндынг з пункту гледжання развіцця прадпрыемства?***

— Рэбрэндынг на прадпрыемствах неабходны, асабліва цяпер, у XXI стагоддзі. Мяняюцца патрабаванні, падыходы. Новы лагатып дазваляе па-новаму звярнуць увагу на прадукцыю і прыцягнуць спажыўца новага пакалення. Мы павінны ісці ў нагу з часам, шукаць новыя іміджавыя падыходы. Сам прынцып рэбрэндынгу таксама накіраваны на павышэнне канкурэнтаздольнасці. Таму знак павінен быць пазнавальным, сучасным. Мы спрасцілі лагатып, адмовіліся ад грувасткага знака і пакінулі ў новым варыянце толькі дзве літары «В» і «М». Пад новым лагатыпам мы прадставілі на рынак даволі вялікі аб'ём каўбасных вырабаў і паўфабрыкатаў. Толькі за адзін 2023 год, калі пачаўся



Намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці і якасці Аляксандр ГЕСЬ.

рэбрэндынг, мы выдалі 40 новых відаў каўбас і 18 відаў паўфабрыкатаў.

***— Атрымліваецца, што стаўка на рэбрэндынг сябе апраўдала?***

— Стараемся рабіць акцэнт і ўлічваць патрабаванні маладога пакалення, выходзім з рэкламнай прадукцыяй у сацыяльныя сеткі. Мы заўважылі, што ў моладзі карыстаюцца папулярнасцю паўфабрыкаты, якія дазваляюць мінімізаваць час на прыгатаванне ежы. Наш фірменны гандаль дазваляе задаволіць іх патрабаванні. Акрамя катлет, мы распрацавалі біточкі, паўфабрыкаты з ялавічыны для барбекю і многае іншае.

Тут ёсць важны момант. Калі смак мяняецца, чалавек перастае давяраць. Таму ўсім, хто прыходзіць да нас працаваць, даецца такі наказ: «Ніколі не падманвай спажыўца». І гэта свайго роду дэвіз нашага камбіната. Трэба трымаць высокую планку пастаянна.

***— А свае традыцыйныя вырабы захоўваеце ў асартыменце? Ці новая прадукцыя выціскае былую?***

— Вядома ж, не. Ваўкавыскі мясакамбінат не адмаўляецца ад сваіх традыцый, бо яны заваявалі прызнанне нашых спажыўцоў, нягледзячы на кошт. Мы не пакінулі вытворчасць каўбасных вырабаў згодна з савецкім ДАСТам, які атрымаў аднаўленне ў 2019 годзе. Гэта, напрыклад, каўбаса «Доктарская», сасіскі «Любіцельскія». Яшчэ засталіся некаторыя найменні каўбасных вырабаў, якія вырабляюцца менавіта па тэхналогіі нашага прадпрыемства з мінімальнай колькасцю харчовых дабавак. Таксама традыцыйнай у нас застаецца вытворчасць сыравэнджаных і сыравяленых вырабаў. Участак быў уведзены 20 гадоў таму, за гэты час мы абнавілі лінейку, але падыходы і тэхналогіі застаюцца традыцыйнымі, што дазваляе спажыўцам атрымліваць высакаякасную прадукцыю па даступным кошце.

***— На прадпрыемстве бачны пастаянны рух: машыны пад'язджаюць, ідзе загрузка прадукцыі. Вядома, што гэта пастаўкі на ўнутраны рынак. Ці атрымлівае вашу прадукцыю замежны спажывец?***

— Вядома, большая частка прадукцыі паступае на ўнутраны рынак. Разам з тым развіваецца і экспартны кірунак. Апошнім часам мы зрабілі галоўны акцэнт на выраб паўфабрыкатаў з ялавічыны, што дазваляе нам удала канкурыраваць на знешніх рынках. Дзякуючы сертыфікаваным сістэмам менеджменту бяспекі харчовых прадуктаў, якія ёсць на прадпрыемстве, а таксама сістэме правілаў «Халяль», мы адпраўляем прадукцыю ў азіяцкія краіны і КНР. Нашу каўбасу купляюць краіны СНД. Адным з трывалых партнёраў застаецца Расійская Федэрацыя.

***— Патэнцыял прадпрыемства расце, як бачна?***

— Мы расцём і развіваемся. Думаем пра будучыню. І тут варта зазначыць важнасць працы нашых работнікаў, спецыялістаў. Гэта вельмі каштоўны рэсурс і самыя неабходныя інвестыцыі. Абсталяванне не будзе працаваць без спецыялістаў. Разам з тым мы плануем палепшыць умовы працы работнікаў, аблегчыць працу на больш складаных участках. Гаворка ідзе аб аўтаматызацыі некаторых працаёмкіх працэсаў.

***— Мадэрнізацыя і паляпшэнне ўмоў працы — гэта павестка дня завода?***

— У нас прадпрыемства поўнага цыкла. Гэта даволі вялікі вытворчы аб'ект. На бліжэйшыя некалькі гадоў мы бачым перспектыву ў магчымасці развіцця спажывецкай упакоўкі і ў сэрвісе продажу. Што датычыцца ўпакоўкі, тут будзем арыентавацца на розныя вагавыя порцыі. Зараз запатрабаваны гатовыя нарэзкі, вакуумныя ўпакоўкі. Для гэтага і патрэбны адпаведныя механізмы. Газавае асяроддзе прадукцыі дазволіць павялічыць тэрмін захоўвання і адпраўку яе на дальнія адлегласці. Гэта вельмі важны момант.

Не варта забываць і пра сэрвіс абслугоўвання. Каб своечасова і ў тэрмін наша прадукцыя паступала да спажыўца.

***— Фірменны гандаль плануеце пашыраць?***

— У нас 19 фірменных крам у Беларусі. Гэта выгадна для камбіната, таму што ёсць прамая сувязь са спажыўцом. Мы пастаянна вядзём работу ў гэтым кірунку і зацікаўлены ў пашырэнні геаграфіі паставак у найбольш перспектыўныя рэгіёны. Канкурэнцыя ў нашай справе даволі моцная, бо іншыя мясакамбінаты, у тым ліку нашы гродзенскія суседзі, таксама імкнуцца нарошчваць магутнасці і шукаюць рынкі збыту. Таму трэба быць пастаянна ў тонусе, каб мець эфект.

Сёння развіваецца сетка жорсткіх дыскаўнтараў, там вялікая праходнасць, таму важна наладжваць супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне з сеткавымі крамамі.

Мы бачым, што Беларусь у дастатковай ступені забяспечыла сябе харчовымі прадуктамі, у прыватнасці малаком і мясам, цяпер ставіцца задача нарошчваць экспартны патэнцыял. Трыццаць працэнтаў прадукцыі мы можам без урону для нашых спажыўцоў прадаваць за мяжу.

***— На ваш погляд, што можа даць для развіцця эканомікі Год якасці?***

— Вельмі важна, што гэты фактар акрэслілі на дзяржаўным узроўні. Такі падыход працуе, у першую чаргу, на карысць спажыўца. У нашай краіне сістэма стандартызацыі мае шырокі спектр кампетэнцый, якія дазваляюць забяспечваць высокі ўзровень адпаведнасці сусветным трэндам. Бяспека, якасць, канкурэнтаздольнасць — гэта сфера нашай дзейнасці. Год якасці закранае ўсе сферы дзейнасці, пачынаючы ад эканомікі і заканчваючы сацыяльнай адказнасцю кожнага грамадзяніна. Якасць — гэта брэнд нашай краіны. Менавіта якасць — найважнейшы драйвер развіцця нашай эканомікі.

***— Вызначаны і знак якасці. Вы будзеце прэтэндаваць на тое, каб ваша прадукцыя была пазначана ім?***

— Праект палажэння аб удзелу ў конкурсе ўжо ёсць, там вызначаны пэўныя крытэрыі. Мы думаем прадставіць сваю прадукцыю на разгляд камісіі для атрымання такой высокай маркіроўкі. Пакуль не вызначылі, якая гэта прадукцыя, але адназначна, мы возьмем удзел у спаборніцтве за званне прадукцыі са знакам якасці. І перадумовы ў нас для гэтага ёсць. Прадпрыемства з'яўляецца лаўрэатам конкурса прэміі ўрада ў вобласці якасці, якую мы падцвярджаем адзін раз у тры гады. Гэта вельмі высокі ўзровень.

### Стаўка на якасць

**Начальнік лабараторыі Ларыса БЕЙ** паведаміла, як спецыялісты трымаюць на кантролі ўвесь тэхналагічны ланцужок:

— Мы працуем па зацверджаных стандартах і ДАСТах, кантралюем прадукцыю на ўсіх этапах — ад паступлення сыравіны да рэалізацыі прадукцыі, якая праходзіць арганалептычныя, фізіка-хімічныя, радыёлагічныя, мікрабіялагічныя выпрабаванні. Пры гэтым сыравіна даследуецца на канчатковае ўтрыманне антыбіётыкаў, а ўся прадукцыя — на ўтрыманне таксічных элементаў, пестыцыдаў і іншых шкодных рэчываў.

Работнікі лабараторыі вядуць санітарна-гігіенічны кантроль вытворчых памяшканняў, інвентару, тары, абсталявання, адзення і рук работнікаў. Аб'ёмы вытворчасці павялічваюцца, з'яўляюцца новыя віды прадукцыі. Некаторыя ўзоры мы накіроўваем на дадатковы аналіз у акрэдытаваныя лабараторыі на дагаворнай аснове.

Работа лабараторыі накіравана на якасць і бяспеку прадукцыі. Не бывае такога, каб гатовая прадукцыя даходзіла да выбракоўкі. Калі ёсць парушэнні нормаў, гэта выпраўляецца на першаснай стадыі. Кантроль сыравіны і матэрыялаў праводзіцца з тым улікам, каб не дапусціць спынення вытворчасці. Наша дзейнасць накіравана на выпуск толькі якаснай прадукцыі, якая канкурыруе як на ўнутраным рынку, так і на знешнім.



Бактэрыёлаг Святлана ДАНЬКО праводзіць мікрабіялагічныя выпрабаванні прадукцыі ў бактэрыялагічным аддзеле вытворчай лабараторыі.



Начальнік лабараторыі Ларыса БЕЙ разам з хімікам Таццянай МАЙРЫНАЙ абмяркоўваюць вынікі фізіка-хімічных выпрабаванняў каўбасных вырабаў у хімічным аддзеле вытворчай лабараторыі.

### Навінкі і далікатэсы



*У Ваўкавыску выпускаюць незвычайную варана-вэнджаную каўбасу «Шарбон» — чорную на зрэзе з чырвонымі ўкрапінамі. Навінка спадабалася. Але самымі папулярнымі па продажы тут называюць вараную каўбасу «З салам» — аналаг савецкай «Любіцельскай», а таксама сасіскі «Малочныя». У лінейцы сыравяленых каўбас асаблівы попыт на «Царскую» і «Княжацкую».*

